КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ № 5 (228) ◂ 4 лютага ◂ 2011 г.
www.novychas.org

# Новы Час

ISSN 2218-2144



**АЛЕНА ТАНКАЧОВА**

Стар. 6

**УЛАДЗІМІР РОЎДА: КРЭМЛЬ ВЕДАЎ ПРА СІЛАВЫ СЦЭНАР**

Ці сапраўды Еўропа напалохала беларускі рэжым санкцыямі? Журналіст «НЧ» Вольга Хвоін размаўляе з палітолагам Уладзімірам РОЎДАМ

Стар. 5

**СУДАНСКІ РЭФЕРЭНДУМ**

Сепаратысты ўсяго свету каментуюць вынікі рэферэндуму ў Паўднёвым Судане, які дае права яго жыхарам на стварэнне сваёй дзяржавы

Стар. 13

**ВІЦЕБСКІЯ КУРАПАТЫ**

Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

**ЖАНОЧЫ ДОСВЕД УЗБУНТАВАНАГА ЕГІПТУ**

Нарыс Марыі Мартысевіч

▸ **АД РЭДАКТАРА**

# ЗАКЛАДНІКІ І САНКЦЫІ

*Аляксей КАРОЛЬ*

**Не толькі «заклятыя» дэмакраты, але ўсе, у каго ёсць сэрца, парадаваліся вызваленню са следчага ізалятара КДБ, з так званай «амерыканкі», пяці фігурантаў крымінальнай справы, распачатай па слядах падзей 19 снежня на плошчы Незалежнасці.**




Вызваленне даволі ўмоўнае: Уладзіміра Някляева і Ірыну Халіп — пад хатні арышт з утрыманнем пад вартай, з забаронай карыстацца ўсімі сродкамі сувязі і чытаць газеты, Наталлю Радзіну і Сяргея Вазняка — пад падпіску аб нявыездзе.

Далёка не мёд для Уладзіміра з жонкай, для Ірыны з трохгадовым сынам Данікам, яго дзядуляй і бабуляй суіснаваць і дзень, і ноч ва ўласных хатах з чужымі людзьмі, пад пільным позіркам двух кадэбістаў-ахоўнікаў. Па сутнасці, улады пераўтварылі кватэры вязняў у своеасаблівыя турэмныя камеры не толькі для іх саміх, але і для іх родных, далучыўшы да закладнікаў.

Але ж дом ёсць дом, а не турма. І дарагія людзі — побач. І можна крыху перавесці дух. У сем'ях вызваленых скончылася невядомасць, сцішыліся душэўныя трывогі, ажылі надзеі на аптымістычную развязку ўсёй драмы.

Але вось тут якраз — пакуль чорны туман. Гэта яшчэ адзін штрых да беларускага палітычнага сюррэалізму: адных выпускаюць, другіх арыштоўваюць. У тыя ж дні, па тых ж абвінавачваннях. У прыватнасці, 28 студзеня былі схоплены і дастаўлены ў «амерыканку» маладафронтавец Алесь Кіркевіч з Гродна і актывіст «Еўрапейскай Беларусі» Сяргей Казакоў. 22-гадовы Арцём Грыбко стаў 37-м абвінавачаным па крымінальнай справе аб масавых беспарадках.

Усяго ж па гэтай справе ў якасці абвінавачаных і падазраваных, па дадзеных праваабаронцаў, праходзяць больш за 50 чалавек. Суды над імі, як паведаміў міністр унутраных спраў Беларусі Анатоль Куляшоў на адмысловай прэс-канферэнцыі, павінны пачацца ўжо ў лютым.

Тады ў чым жа палітычны сэнс гэтых вызваленняў? Дастаткова нечаканых і нелагічных на фоне разухабістай прапагандысцкай хвалі абвінавачванняў і не сціхаючых рэпрэсій. Чарговая спроба манеўра, новага гандлю закладнікамі? Ці ўсё ж першы крок да вызвалення ўсіх палітвязняў са зняццем з іх усіх абвінавачванняў?

Падаецца, што яснага адказу на гэтыя пытанні пакуль што не мае і сама ўладная групоўка. Дакладна па плану яна правяла аперацыю па разгону плошчы і раскруціла махавік масавых рэпрэсій. А вось з прыцэлам наступстваў памылілася. Не чакала такой аднадушнай і рэзкай ацэнкі гэтых падзей з боку Захаду і такой моцнай хвалі салідарнасці ўнутры краіны. Падвысіць узровень страху ў грамадстве да стану 2006 года ёй не ўдалося. Як і пераканаць людзей у сапраўднасці перамогі А. Лукашэнкі на выбарах, рэальнасці штурму Дома ўрада, змовы апазіцыі на дзяржаўны пераварот. І цяпер рэжым страціў былую ўпэўненасць у сваёй непахіснасці і нервова рэагуе на змены ў сітуацыі.

На гэтым фоне відавочна, што вызваленне злосных «ворагаў народа» адбылося пад пагрозай санкцый, за два дні да іх прыняцця Радай міністраў замежных спраў ЕС. Рэжым разумее, што гэта ёсць разам з тым і праявай пэўнай слабасці, таму і маскіруе яе абмежаваннямі, накладзенымі на Ірыну Халіп і Уладзіміра Някляева, перманентныміператрусамі, выклікамі да допыту ў КДБ, арыштамі і далучэннем да справы новых фігурантаў (звернем увагу — пераважна маладых).

Сама справа аб «змове» яшчэ не адмяняецца, пакуль што ў ёй не болей чым перастаўляюцца акцэнты, пераразмяркоўваюцца ролі і абвінавачванні. Вастрыё галоўнага ўдару пераводзіцца на моладзь.

Схема «стварэння» рознага кшталту змоў — не новая. Мяне не пакідае адчуванне нейкага дзікага дэжа-вю. Як бы ажывае ўяве даўняя, 1930 года, «справа» так званага Саюза вызвалення Беларусі — першага вопыту фальсіфікацыі ў нетрах ДПУ антысавецкай нацдэмаўскай арганізацыі, праўду пра якую мне давялося аднаўляць па дакументах з закрытых архіваў, па сведчаннях ахвяр і карнікаў.

Па «справе СВБ» праходзіла больш за 100 чалавек з беларускай інтэлігенцыі. Але, што характэрна, плануемыя на пачатку суровыя прысуды да турмы і лагераў для большасці былі заменены на адносна мяккія — высылкі ва ўнутраныя губерні СССР (пераважна Саратаўскую). Быў адменены і запланаваны напачатку адкрыты судовы працэс. Сталін вымушаны быў так зрэагаваць на пратэсты той жа беларускай інтэлігенцыі, якую высекчы пад нож яму ўдалося толькі праз 10 гадоў.

Адступленне толькі пад ціскам пратэсту ўнутранага. Ціск звонку, з Захаду, на той час быў адсечаны «жалезнай заслонай», нейтралізаваны адмыслова згатаванай «для замежжа» прапагандай, надзейна замаскіраваны ў абгортку «сацыялістычнай» ідэалогіі. Сучасны беларускі рэжым гэтых абаранляльных ліній цалкам пазбаўлены. І, галоўнае, у яго няма матэрыяльных рэсурсаў для праваядзення палітыкі «апоры на ўласныя сілы». Свой рэсурс ужо 17 гадоў ён здабывае на лавіраванні паміж Захадам і Усходам.

Санкцыі цалкам перакрываюць для беларускіх уладаў магчымасці манеўра на Захад і адначасова пужаюць поўнай залежнасцю ад Крамля. І таму ў руках рэжыму арыштаваныя застаюцца не болей чым матэрыялам для гандлю. Закладнікамі для абмену на інвестыцыі, на аднаўленне стасункаў з Захадам на ўмовах беларускага рэжыму. Гэта значыць, выключна ў сферы эканомікі пры захаванні палітычнага статуса-кво. Змена ўмоў утрымання для пяці чалавек — сігнал менавіта такога кшталту. У якасці такога ж сігналу рыхтуецца і суд, хутчэй за ўсё, адкрыты, паказальны (зноў прывітанне з 1937-га), каб ужо асуджаных апазіцыйных дзеячаў мець за закладнікаў.

Захад адпрэчыў гэты сігнал, пацвердзіўшы патрабаванне вызвалення ўсіх палітычных вязняў пры іх поўнай рэабілітацыі. І ў гэтым ці не галоўны сэнс санкцый, ухваленых Радай міністраў замежных спраў ЕС 31 студзеня. Візавыя санкцый на ўезд у краіны ЕС для 158 асоб, датычных да фальсіфікацыі выбараў і правядзення рэпрэсій, — маральна моцная мера, свайго роду сігнал-папярэджанне пра будучую адказнасць. Нездарма так нервова адрэагавала на яе Ярмошына, назваўшы пералік «расстрэльным спісам». Моцны пасыл мае і ідэя правядзення ў Беларусі новых выбараў. Але не ўведзены эканамічныя санкцыі, найперш на закупку нафтапрадуктаў, якія мелі б найбольшы эфект у найкарацейшы перыяд.

Прынятыя ЕС санкцыі можна назваць мяккімі, іх недастаткова, каб рэалізаваць магчымасці для перамен у Беларусі. Але іх можна назваць і жорсткімі, бо рэзалюцыя пакінула за ЕС права і вызначыла працэдуру пашырэння ці ўзмацнення санкцый у розных сферах, у тым ліку эканамічных, пры невыкананні ўладамі Беларусі патрабаванняў дэмакратызацыі палітычнай сістэмы, парушэнні правоў чалавека. Тым самым закладнікі выведзены Захадам з гандлю, які навязваецца беларускім рэжымам. Іх вызваленне ўведзена ў сістэму каштоўнасцей, сярод якіх чалавек, жыццё чалавека — найвышэйшая каштоўнасць.

САЛІДАРНАСЦЬ

# У ГОСЦІ ДА ХАЛІП

Вольга ХВОІН

**Сябры Беларускай асацыяцыі журналістаў прыйшлі да дома журналісткі Ірыны Халіп з кветкамі і паветранымі шарамі, каб выказаць ёй падтрымку, праявіць салідарнасць з калегай.**

Ірыне Халіп забаронена падыходзіць да вокнаў, карыстацца тэлефонам, кампутарам, таму з журналістамі размаўляла ў пад'ездзе маці Ірыны Люцына Халіп. Яна расказала, што калі Ірына прыехала дадому з СІЗА КДБ, то сын Данік быў вельмі шчаслівы. «Павіс на ёй сказаў: «Я як малпачка...», — расказала пра рэакцыю трохгадовага хлопчыка Люцына Халіп. — Спытаў: чаму ты без таты? Мы сказалі, што тата працуе, і таму затрымліваецца».

Люцына Юр'еўна расказала, што двое супрацоўнікаў КДБ, якія ўвесь час знаходзяцца ў кватэры, паводзяць сябе прыстойна. Але гарбатай іх сям'я Ірыны не поіць і абедамі не частуе, бо «з чаго б гэта?». Яна сказала, што Ірына будзе вельмі ўсцешаная падтрымцы калег.

Цікава, што калі журналісты размаўлялі з Люцынай Юр'еўнай, дзверы пад'езду адчыніў вядомы дырыжор Міхаіл Фінберг. Але, пабачыўшы натоўп журналістаў з відэакамерай, фотаапаратамі і кветкамі, хуценька рэціраваўся на вуліцу. Журналісты выказалі здагадку, што кампазітар папросту не захацеў патрапіць у кадр разам з «нячэснымі» журналістамі.

«Сімвалічна, што калі мы стаялі пад вокнамі Ірыны Халіп, у Брусэлі адбываўся разгляд беларускага пытання, — зазначыў сябра БАЖу Эдуард Мельнікаў. — Напэўна, мы мусім размічваць на тое, што міжнародная, журналісцкая падтрымка, кіраўнікоў іншых дзяржаў мае сэнс, дапаможа ўтрымаць сітуацыю ад яшчэ горшых падзей, чым мы маем».

На наступны дзень пасля сустрэчы з Люцынай Халіп стала вядома: супрацоўнікі КДБ папярэдзілі, што інтэрв'ю журналістам, якія даюць бацькі, могуць нашкодзіць Ірыне Халіп.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

# ПЕРШЫЯ ЛІСТЫ

Алена ВАРАЖБЕЙ

**Сябры і калегі Зміцера Дашкевіча атрымалі ад яго лісты. Гэта першыя звесткі, якія дайшлі ад палітвязня пасля месяца яго зняволення.**

«Пішу штодня, але як у нікуды...» — паведаміў ён. Лісты ад сяброў нарэшце прапусцілі і да яго.

«Гэта першая пошта, якую я атрымаў за месяц сваёй адсідкі», — напісаў лідар Маладога фронту ў лісце да Ганны Шапуцькі. Ад грамадскай актывісткі і ад яе дачкі Таццяны яму ўручылі па два лісты, за што ён ім вельмі ўдзячны.

«Самае кепскае, што нельга тут мець кнігі», — адзначыў Зміцер. Але Біблію, як паведаміў вязень, ён чытае штодня. Ён вельмі хвалюецца за Насту Палажанку, якая зараз знаходзіцца ў СІЗА КДБ. Намесніцу старшыні Маладога фронту, як і шмат іншых актывістаў, абвінавацілі ў арганізацыі «масавых беспарадкаў» 19 снежня. «Страшна падумаць, што дзяўчынцы ў 20 гадоў пагражае, — піша Зміцер. — Але, перакананы, што Лука столькі палітвязняў не пацягне».

«Са мною ж гісторыя троху іншая — бандзюга я! «Кідаюся» на нявінных людзей у падваротнях», — зазначыў ён. Як вядома, Дашкевіч і сябра Маладога фронту Эдуард Лобаў абвінавачаны ў беспадстаўным і наўмысным збіванні грамадзян (ч. 3 арт. 339 Крымінальнага кодэкса — асабліва злоснае хуліганства). Хлопцаў затрымалі разам на вуліцы супрацоўнікі ў цывільным за дзень да выбараў, 18 снежня. Зараз яны знаходзяцца ў жодзінскай турме. Ім пагражае ад 3 да 10 гадоў зняволення.

«Думаю, што і яшчэ пару артыкульчыкаў паспрабуюць навесіць. Але тут ужо ўсё адно — плюс-мінус пару гадоў мала што вырашаюць», — лічыць Дашкевіч. «Трымайцеся там! Няхай Ісус Хрыстос блаславіць вашы шчырыя і самаахвярныя сэрцы Сваім мірам», — пажадаў Зміцер сябрам.

На думку Ганны Шапуцькі, Дашкевіч вельмі небяспечны для ўладаў. І яны не маглі яго не арыштаваць. «Зміцер — той чалавек, які мог бы павесці за сабой людзей. Ён верыць у Бога, і гэта дадае яму моцы. Ад яго атрымліваеш вельмі моцны энергетычны зарад. Усе ведаюць, як Зміцер выступае перад людзьмі на плошчы. Такіх лідараў і такіх прамоўцаў сярод нашых кандыдатаў у прэзідэнты, на жаль, не было ні аднаго».

Зміцера Дашкевіча неаднаразова збівалі міліцыянты. У кастрычніку 2006 года ён быў асуджаны да 1,5 гадоў зняволення за дзейнасць ад імя незарэгістраванай арганізацыі. «Але ж ён не зламаўся. Ён толькі ўзмацняўся пасля іспытаў, якія на яго долю выпалі. Моцны хлопец. Сапраўдны лідар. Я вельмі ім захапляюся», — зазначыла Ганна Шапуцька.

**P.S.** Зміцеру Дашкевічу і Эдуарду Лобаву лісты дасылаюцца на адрас:

222160, Мінская вобласць, г. Жодзіна, вул. Савецкая, 22 а.

ЛІСТ

# АНІШЧАНКА — ВАСІЛЕВІЧУ

**Грамадскі актывіст, гісторык Яўген Аніщчанка накіраваў генеральнаму пракурору Рыгору Васілевічу адкрыты ліст.**

«Нядаўна па БТ дэманстраваўся фільм «Площадь. Железом по стеклу», у якім прыводзіцца тэлефонныя размовы актывістаў перадвыбарчых штабоў кандыдатаў у прэзідэнты. У афіцыйнай газеце «Советская Белоруссия» таксама цытуюцца вытрымкі з перамоваў па сістэме «Скайп» прыхільнікаў кандыдатаў у прэзідэнты ад апазіцыі. Тым самым адкрыта заяўляецца, што ў краіне доўгі час вядзецца тайнае праслухоўванне мабільных тэлефонаў, якімі карыстаюцца практычна ўсе дарослыя жыхары (і іх дзеці) краіны... Гэтым прызнаецца, што ў краіне штодня парушаецца тайна карэспандэнцыі, што ў краіне на справе адменена гарантаванае арт. 28 дзеючай Канстытуцыі права на абарону ад незаконнага ўмяшання ў асабістае жыццё грамадзян. Дзяржаўныя СМІ тым самым афіцыйна прызналі, што Канстытуцыя ў нас — пустая дэкларацыя», — адзначаецца ў лісце.

«У арт. 137 сярод кола Вашых службовых абавязкаў ясна прадпісана: кіравацца правілам, што Канстытуцыя стаіць вышэй любога закона або дэкрэта. Зыходзячы з гэтых норм, Вы абавязаны распачаць крымінальны пераслед і пакараць тых, хто арганізаваў і праводзіць падобныя антыканстытуцыйныя дзеянні ў адносінах да грамадзян. Пакажыце, сп. Васілевіч, па чыёй ініцыятыве, на якой падставе і ў рамках якой крымінальнай справы адбываецца падобнае масавае зневажанне канстытуцыйных правоў грамадзян. Ваша нежаданне або адмаўленне ад крымінальнага пакарання парушальнікаў Асноўнага закона будзе азначаць спрыянне іх беззаконнай дзейнасці і зробіць Вас непасрэдным саўдзельнікам гэтых злачынстваў», — папярэджвае Яўген Анішчанка.

Актывіст заклікае пракурора прадэманстраваць «сваю рашучасць спыніць хамскае зневажанне элементарнай годнасці грамадзян. «Пакажыце сваімі праваабарончымі дзеяннямі, сп. пракурор, што нікому ў краіне, уключаючы прэзідэнта, не дазволена абыходзіцца з выбаршчыкамі як са злачынцамі ў лагернай зоне», — гаворыцца ў лісце.

СЯБРЫ

# ВЕНЕСУЭЛА ДАПАМОЖА І ГАЗАМ

Вольга ХВОІН

**«Усе дамоўленасці па пастаўках нафты застаюцца ў сіле», — запэўніў надзвычайны і паўнамоцны пасол Баліварскай Рэспублікі Венесуэла ў Рэспубліцы Беларусь Амерыка Дыяс Нуньес.**

Паводле яго слоў, у мінулым годзе ў гісторыі развіцця гандлёва-эканамічных адносін адбыўся важны прарыў: з мэтай дыверсіфікацыі паставак энергарэсурсаў Беларусь закупіла ў Венесуэлы вялікія аб'ёмы нафты. Бліжэйшым часам будзе разглядацца варыянт паставак у Беларусь азербайджанскай нафты па своп-кантракту, што дазволіць скараціць затраты часу і грошай на транспарціроўку. То бок Азербайджан пастаўляе ў Беларусь нафту і атрымлівае наўзамен адпаведныя аб'ёмы нафты ў Венесуэле, пастаўляе яе на рынкі краін Карыбскага басейну. «Трэба ўлічваць час і адлегласць. Ад Венесуэлы да чарнаморскіх партоў 13 800 кіламетраў, з Азербайджана да гэтых жа партоў — 1 300 кіламетраў», — патлумачыў пасол Венесуэлы ў Беларусі.

Пасол зазначыў, што Беларусь і Венесуэла цяпер рэалізуюць больш за 120 дамоваў і кантрактаў у розных сферах — ад здабычы нафты, будаўніцтва аўтамабільных заводаў і да супрацоўніцтва ў сферы адукацыі і культуры.

Па словах пасла, Беларусь актыўна супрацоўнічае з Венесуэлай у галіне будаўніцтва. Ёсць дамоўленасці, што беларускія спецыялісты пабудуюць у Венесуэле сучасны аграпрамысловы гарадок. Цяпер распрацоўваецца пілотны план па стварэнню такога гарадка ў сельскагаспадарчым штаце Гуарыка.

У сувязі з вялізным дэфіцытам жылля ў Венесуэле, які ацэньваецца ў два мільёна кватэр, Беларусь пабудуе ў Венесуэле каля 30 тысяч кватэр. Пасол адзначыў праекты па будаўніцтву жылля на дзвюх вайсковых базах. У сувязі са стыхійнымі бедствамі, што абрынуліся на Венесуэлу напрыканцы мінулага года, ідзе абмеркаванне дадатковага аб'ёму будаўніцтва беларусамі ў 10 тысяч кватэр. Рашэнне па гэтым праекце будзе прынятае ў лютым у Каракасе на пасяджэнні сумеснай беларуска-венесуэльскай камісіі. Таксама бакі плануюць абмеркаваць ход рэалізацыі інвестыцыйных праектаў, выкананне дасягнутых раней дамоўленасцяў, а таксама пытанні арганізацыі візіту кіраўніка Беларусі Аляксандра Лукашэнкі ў Венесуэлу.

Пасол падзякаваў Беларусі, якая дапамагала дзіцячымі рэчамі, палаткамі, медыкаментамі пацярпелым жыхарам Венесуэлы ад стыхійных бедстваў напрыканцы мінулага года. Амерыка Дыяс Нуньес сказаў, што гуманітарную дапамогу Венесуэлу пастаўлялі таксама Іран, Іспанія, Аргенціна, Нікарагуа.

У гэтым годзе Венесуэла адзначае 200-годдзе незалежнасці. 5 ліпеня 1811 года Нацыянальны кангрэс абвясціў краіну вольнай ад каланіяльнага прыгнёту. Таксама ў лютым лацінаамерыканская дзяржава святкуе 12-я ўгодкі Баліварскай рэвалюцыі, падчас якой у Венесуэле да ўлады прыйшоў цяперашні сябра Аляксандра Лукашэнкі Уга Чавес.

ПРАЕКТ

# ПАГАВОРЫМ ПА-БЕЛАРУСКУ

Альбіна ВІШНЕЎСКАЯ

**Таварыства беларускай мовы распрацавала праект закона аб дзяржаўнай падтрымцы беларускай мовы. Рада арганізацыі 30 студзеня ўхваліла яго ў першым варыянце. Створана рабочая група па дапрацоўцы дакумента на чале з філолагам Лявонам Баршчэўскім.**

Праект будзе вынесены для зацвярджэння на з'ездзе арганізацыі, а пасля накіраваны ў Савет міністраў. «Яго асноўныя палажэнні — каб беларуская мова займела сапраўднае сваё месца, а не тое, якое ёй далі зараз. Гарантам беларускай мовы павінен быць урад. Таксама трэба стварыць дэпартамент або міністэрства па прапагандзе беларускай мовы», — заявіў кіраўнік ТБМ Алег Трусаў.

Гэта ведамства, па задуме ініцыятараў, павінна кантраляваць выкананне Закона аб мовах усімі юрыдычнымі асобамі. Прычым незалежна ад формы ўласнасці і сферы дзейнасці. Дзяржаўным чыноўнікам уключна з прэм'ер-міністрам і прэзідэнтам, як прадугледжана, неабходна дасканала валодаць беларускай мовай. І на ёй жа ажыццяўляць дзяржаўную дзейнасць. «Прэзідэнт Беларусі падчас афіцыйных, публічных, культурніцкіх і іншых мерапрыемстваў асабістым прыкладам падтрымлівае і прапагандуе беларускую мову», — зазначана ў адным з палажэнняў. І арганізуе дзейнасць усёй уладнай вертыкалі па-беларуску.

Міжнародны дзень роднай мовы 21 лютага сябры ТБМ і яго прыхільнікі адзначаць IV агульнанацыянальнай дыктоўкай. Яна прысвечана юбілею Максіма Багдановіча і пройдзе як у Беларусі, так і за яе межамі. Для дыктоўкі абраны верш паэта «Я хацеў бы спаткацца з Вамі на вуліцы...» і празаічны тэкст «Хто мы такія?»

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# ЖЫЦЦЁ Ў РОЗНЫХ КРАІНАХ

Сяргей САЛАЎЁЎ



**Чым больш чуюцца розныя абяцанні беларускага ўрада пра паляпшэнне дабрабыту беларускага народа, чым больш распрацоўваецца розных праграмаў сацыяльна-эканамічнага развіцця, тым больш здаецца, што насельніцтва і ўрад жывуць у розных краінах.**

На пашыраным пасяджэнні Савета міністраў міністр эканомікі Мікалай Снапкоў, які выкладаў праект праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2011–2015 гады, заявіў, што да 2015 года сярэднюю заработную плату ў Беларусі плануецца давесці да 80% ад узроўню зарплаты ў сумежных еўрапейскіх краінах.

«Пераход на інавацыйны шлях развіцця патрабуе стварэння ўмоў па забеспячэнні належнага ўзроўню заработнай платы для эканамічна актыўнага насельніцтва. Арыенцірам павінна стаць набліжэнне да 2015 года да ўзроўню не менш як 80% ад зарплаты ў сумежных еўрапейскіх краінах», — сказаў Снапкоў.

Так і хочацца пракаментаваць: «Оп-ля! Зноў!» Здаецца, тое самае абяцаў Аляксандр Лукашэнка яшчэ ў 2001 годзе — давесці «ў бліжэйшую пяцігодку» заробак да ўзроўню еўрапейскіх краінаў. Сваё ж абяцанне ён паўтарыў напярэдадні выбараў 2006 года. Дзесяць гадоў чакаем выканання абяцанак і ніяк не можам дачакацца.

Паводле слоў Снапкова, неабходна «выключыць утрыманскія настроі, адыходзіць ад ураўнілаўкі», падтрымліваць рэальны ўзровень пенсійных выплат, зыходзячы з росту рэальнай заработнай платы.

Міністр звярнуў увагу, што рост грашовых даходаў прывяздзе да росту ўнутранага спажывецкага попыту. У сувязі з гэтым, зазначыў ён, «неабходна стварыць умовы па скарачэнні канцавога спажывання і перанакіраванні часткі грашовых сродкаў у нацыянальнай валюце ў зберажэнні». Для гэтага, паводле слоў Снапкова, неабходна падтрыманне нізкіх тэмпаў інфляцыі.

Мала таго, што пра «выключэнне ўтрыманскіх настрояў» мы таксама неаднаразова чулі. Але як можна гэтыя настроі выключыць? Асабліва тады, калі ўлада нават са скрыпам не пагаджаецца на лібералізацыю ў дачыненні прадпрымальнікаў? Бізнэсоўцы якраз і сціраваныя на «выключэнне ўтрыманскіх настрояў» і на зараблянне грошай сваёй працай. Але ж ліквідацыя шапікаў, абмежаванне на найм працоўных, залішні падатковы ціск ды бюракратычная машына якраз і супярэчаць таму, што сказаў Снапкоў.

Каб не хлусіць сваім грамадзянам, Снапкову трэба было б дакладна фармуляваць свае выказванні. Кшталту, «сярэднюю заработную плату ў Беларусі плануецца давесці да 80% ад узроўню зарплаты ў сумежных еўрапейскіх краінах. Напрыклад, ад узроўню зарплаты ва Украіне». Тады б усе ведалі, пра што кажа Снапкоў.

Пакуль беларускія ўрадаўцы лётаюць у аблоках, іх паступова апускаюць на зямлю замежныя калегі. Міжнародны валютны фонд рэкамендуе ўраду Беларусі абмежаваць тэмпы росту заработнай платы. Пра гэта заявіў журналістам кіраўнік місіі МВФ па Беларусі Крыс Джарвіс 2 лютага ў Мінску пасля сустрэчы ў беларускім урадзе.

«Мы рэкамендуем ураду ў 2011 годзе прытрымлівацца стрыманай палітыкі адносна заработнай платы», — сказаў Джарвіс. На яго думку, рэзкі рост зарплаты ў 2010 годзе прывёў да негатыўных наступстваў у эканоміцы краіны. «Мы мяркуем, што рост зарплаты прывёў да павелічэння дэфіцыту рахунку наяўных аперацый у канцы 2010 года, і такі ўплыў захаваецца ў 2011 годзе», — зазначыў кіраўнік місіі МВФ. «Нас таксама турбуе, што такое значнае павышэнне зарплаты можа негатыўна адбіцца на канкурэнтаздольнасці беларускай эканомікі», — падкрэсліў Джарвіс.

Вось так. Чым бліжэй «еўрапейскі заробак», тым больш праблем у эканоміцы Беларусі. Можа, трэба было б адмовіцца ад фантазій і паглядзець на свае патрабаванні больш цвяроза?

Тым больш, што 31 студзеня Савет міністраў замежных спраў Еўрасаюза прыняў палітычнае рашэнне пра ўвядзенне візавых санкцый у дачыненні да 158 беларускіх чыноўнікаў і замарожванне іх банкаўскіх актываў у выпадку выяўлення. Аднак Еўропа ўстрымалася ад прымянення да Беларусі эканамічных санкцый.

Хтосьці, можа, і будзе пляскаць у ладкі з нагоды таго, што эканамічных санкцый не будзе. Але спяшацца не трэба. Краіна, супраць якой уведзеныя санкцыі, хоць і візавыя, аўтаматычна трапляе ў спіс больш пільнай увагі замежных інвестараў. Інвестары з краін Еўрасаюза тройчы падумаюць, перш чым укладаць грошы ў праекты ў Беларусі. Еўрапейскія банкі таксама будуць думаць, даваць Беларусі крэдыты ці не даваць. І гэта тычыцца не толькі еўрапейскіх інвестараў і банкаў, а ўсяго сусвету.

Адметная ў гэтым накірунку пазіцыя Расіі. Здаецца, ужо «дацісnулі» і «нагнулі» Беларусь па ўсіх пытаннях нафты і газа. Што яшчэ трэба? Не, Расія раптам «патрабуе дзіўнага». Прыкладам, асцярожна, пакрысе, але намякае на дэмакратызацыю.

Расія не падтрымлівае санкцыі супраць Беларусі, аднак масавыя арышты пасля выбараў з'яўляюцца непрымальнымі, заявіў 2 лютага кіраўнік МЗС РФ Сяргей Лаўроў.

«Тое, што адбылося пасля завяршэння галасавання, з'яўлецца непрымальным. І Расія выказалася дакладна не толькі таму, што былі затрыманы нашы грамадзяне, а таму, што ў цэлым хваля арыштаў не можа не выклікаць адпаведных эмоцый», — заявіў Лаўроў. «Упэўнены, што вырашаць гэтыя задачы неабходна праз садзейнічанне дыялогу, які ўцягваў бы Беларусь у шматбаковыя працэсы і тым самым дапамагаў бы вызначаць эканамічныя рэформы і ўмацоўваць дэмакратыю», — падкрэсліў Лаўроў.

А зараз — увага. У тым жа спічы Лаўроў выказаў надзею, што беларускія ўлады аператыўна адрэагуюць на патрабаванне Захаду вызваліць арыштаваных кандыдатаў у прэзідэнты, журналістаў і праваабаронцаў, а таксама забяспечаць абарону правоў чалавека і палітычных свабодаў.

А ўвогуле, для таго, каб дабрабыт беларускіх чыноўнікаў не скаціўся б ніжэй плінтуса, усім трэба тэрмінова перайсці ў апазіцыю. Еўракамісія павялічыць падтрымку беларускага грамадства ў чатыры разы — да 15,6 мільёна еўра. Пра гэта заявіў 2 лютага еўракамісар па пытаннях пашырэння і Еўрапейскай палітыкі добрасуседства Штэфан Фюле, выступаючы на міжнароднай канферэнцыі донараў «Салідарнасць з Беларуссю» ў Варшаве.

Еўракамісар падкрэсліў: павелічэнне падтрымкі закране найперш няўрадавыя арганізацыі, незалежныя СМІ і студэнтаў.

Паводле інфармацыі Фюле, бюджэт Еўрасаюза на падтрымку ахвяраў рэпрэсій і іх сем'яў складзе 1,7 мільёна еўра; 1 мільён плануецца штогод накіроўваць на падтрымку незалежных устаноў адукацыі. Еўракамісар зазначыў, што ЕС імкнецца да пашырэння стыпендый у межах студэнцкіх абменаў з Беларуссю.

Так што беларускім эканамістам лепш хутчэй перапрафілявацца ў студэнты, бо веды — гэта не толькі моц, але, аказваецца, і грошы.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ



### ПЁТР ПРАКАПОВІЧ

Старшыня Нацыянальнага банка Пётр Пракаповіч на пасяджэнні Савета міністраў папярэдзіў, што сітуацыя ў знешнім гандлі ставіць пад пагрозу зрыву выкананне праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2011–2015 гады. «Калі мы не вырашым пытанне з дадатным сальда знешняга гандлю да 2014 года, то ўсе нашы планы, праекты, у тым ліку па павышэнні жыццёвага ўзроўню насельніцтва, могуць апынуцца пад пагрозай зрыву. Не гаворачы ўжо пра эканамічную і фінансавую бяспеку», — падкрэсліў Пракаповіч. Паводле яго слоў, паказчык знешнегандлёвага сальда «мусіць быць галоўным для ўсіх галінаў, міністраў, віцэ-прэм'ераў». «Калі гэта не вырашым, то навошта разглядаць усё астатняе?» — цытуе Пракаповіча БелаПАН.

Кіраўнік Нацбанку нагадаў, што праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця прадугледжвае зніжэнне адмоўнага знешнегандлёвага сальда пачынаючы з 2011 года. «Сёлета запланавана самае высокае адмоўнае сальда — 9% да ВУП. Далей яно павінна зніжацца», — заявіў Пракаповіч. Паводле яго слоў, адной з асноўных прычын павелічэння адмоўнага сальда з'яўляецца рост імпартаёмістасці і энергаёмістасці прадукцыі. На думку кіраўніка Нацбанку, зараз — «ідэальныя магчымасці» для развіцця эканомікі. «Такой спрыяльнай сітуацыі, як сёння, ніколі не было для развіцця эканомікі. У свеце дастаткова фінансавых рэсурсаў, і яны незапатрабаваныя, і мы можам іх выкарыстаць», — мяркуе ён.

### МАКСІМ МІРНЫ



Беларускі тэнісіст Максім Мірны застаўся на сёмым месцы ў рэйтынгу парных гульцоў. На адкрытым чэмпіянаце Аўстраліі — першым з чатырох у сезоне турніраў «Вялікага шлема» — Мірны і яго новы партнёр Даніэль Нестар (Нестаравіч) з Канады дайшлі да паўфіналу. Нестар па выніках турніру перамясціўся з чацвёртай на трэцюю пазіцыю. Максім Мірны ўжо некалькі гадоў не выступае ў адзіночным разрадзе. У 2003 годзе Максім Мірны заваяваў тытул першай ракеткі свету ў парным разрадзе.

Сям'я беларускага тэнісіста жыве на два дамы, адзін з іх у Мінску, другі — у амерыканскім мястэчку Брэдэнтан. У Макса і Ксеніі Мірных дзве дачкі і сын.

Ніхто з суайчыннікаў Мірнага не ўваходзіць у лік 200 лепшых тэнісістаў. Уладзімір Ігнацік займае 211-е месца (у папярэднім рэйтынгу 201-е), Сяргей Бетаў — 381-е (376-е), Аляксандр Буры — 513-е (512-е). У парным рэйтынгу лепшым з'яўляецца Ігнацік — 162-я пазіцыя (была 157-я).

Вікторыя Азаранка засталася на дзявятым месцы ў жаночым адзіночным рэйтынгу (у Аўстраліі дайшла да 1/8 фіналу) і паднялася з 44-га на 25-е ў парным (выступіла ў фінале чэмпіянату).

### ВІКТОРЫЯ ЛУКАШЭНКА



Унучка кіраўніка Беларусі Аляксандра Лукашэнкі знялася ў новым расійскім серыяле «Варажба пры свечках», прэм'ера якога адбудзецца на Першым канале. Гэта рамантычная гісторыя Папялушкі з экстрасэнсорнымі здольнасцямі, якая прыехала скарыць Маскву і знайшла ў сталіцы сваё каханне.

Здымкі серыяла праходзілі ў сталіцы Беларусі. «Мінск не так нашпігаваны рэкламай, як Масква, — распавёў рэжысёр фільма Вадзім Дзербенёў, — і з адміністрацыямі пункта гледзішча значна лягчэй. Мы здымалі ў Маскве ў раёне Хамоўнікі — там адзін бок вуліцы адносіцца да адной управы, іншы — да другой. Як толькі артыст перайшоў праз дарогу, і мы перанеслі туды камеру — тут жа падышоў міліцыянер».

На галоўныя ролі ў серыял былі запрошаныя не толькі расійскія, але і беларускія акцёры — Уладзімір Гасцюхін, Святлана Кажамякіна.

Віка Лукашэнка сыграла ролю галоўнай гераіні ў дзяцінстве.

На здымкі Віка прыязджала з аховай. Раней унучка Лукашэнкі здымалася ў беларускай камедыі «На спіне ў чорнага ката».

▸ АЗБУКА ПАЛІТАЛОГІІ

# РЭСПУБЛІКА ТАЛЕРАНТНЫХ МАНІХЕЯЎ

Сяргей НІКАЛЮК

**Рэвалюцыя ёсць спосаб уключэння ў дыялог наконт будучыні краіны грамадзян, пазбаўленых уладай палітычных правоў.**



У трэцім стагоддзі нашага часу жыў у Вавілоне перс Ваб, аўтар рэлігійнага вучэння, якое адыграла велізарную ролю ў фармаванні светапогляду беларусаў. Паслядоўнікі адукаванага перса разглядаюць Сусвет у якасці поля вечнай бітвы дзвюх касмічных сутнасцяў — Света і Цемры («нашых» і «не нашых», улады і апазіцыі), паміж якімі не можа быць пагаднення, не можа адбывацца ніякага дыялогу.

Асноўная асаблівасць маніхейства ў беларускім варыянце палягае ў тым, што яе носьбітам з'яўляецца народ, вядомы сваёй талерантнасцю (ад лац. tolerantia — цярпенне), г. зн. сваёй памяркоўнасцю да **чужога** ладу жыцця, паводзінаў, звычаяў, пачуццяў, меркаванняў, ідэй, вераванняў. Прыметнік «чужы» я вылучыў невыпадкова. Да небеларусаў беларусы ставяцца талерантна. Маніхейства беларусаў выяўляецца ў адносінах адзін да аднаго.

Гэта пра «не нашых» было сказана на прэс-канферэнцыі 20 снежня: *«Ну, подумаешь, палкой по голове получили — это самое меньшее зло, которое могло случиться».* Такім чынам, хай радуюцца. Са шматлікіх бедаў, якія назапасіла ўлада, «не нашым» гэтым разам дасталася меншая. Што да «нашых», дык стаўленне да іх выдатна характарызуе наступная цытата: *«Но я никому не позволю, чтобы хоть волосок упал с головы военного человека, милиционера, чекиста или сотрудника спецслужбы, которые худо-бедно обеспечили нам спокойную жизнь».*

## Нацыя як гарызантальны праект

Барацьба Света з Цемрай не прадугледжвае дыялогу. Але там, дзе няма дыялогу, не можа сфармавацца нацыя. Сучасныя нацыі не проста сфармаваліся падчас дыялогу, дыялог — форма існавання нацыі. Калі хтосьці з высокай трыбуны абвяшчае сябе абаронцам нацыянальных інтарэсаў, то рэкамендую пацікавіцца ў абаронцы, дзе і калі адбыўся дыялог, які сфармаваў гэтыя інтарэсы. Калі такога дыялогу не было, то, хутчэй за ўсё, наш абаронца спрабуе сваім асабістым інтарэсам надаць статут нацыянальных.

У сярэднявечных грамадствах стасункі паміж людзьмі выбудоўваліся па вертыкалі. Такой сацыяльнай канструкцыі для свайго ўзнаўлення дыялог быў не патрэбны. Вертыкаль мела патрэбу ў начальніках і падначаленых. Начальнікі аддавалі загады, зыходзячы са сваіх асабістых інтарэсаў, падначаленыя іх выконвалі. Гэта ў ідэале. Рэальныя ж падначаленыя, у сваю чаргу, для кагосьці з'яўляліся начальнікамі, і не варта дзівіцца, што, рэалізуючы чужы інтарэс, яны дамешвалі да яго ўласныя патрэбы.

Беларуская ўладная вертыкаль пабудавана паводле сярэднявечных прынцыпаў. На яе шматлікіх паверхах таксама працуюць «хімікі», якія імкнуцца ператварыць галоўны канцэнтраваны інтарэс у разведзены раствор, таму без належнага кантролю і ўліку любая вертыкаль дэградуе. Свежы прыклад: 27 студзеня Палата прадстаўнікоў зацвердзіла на пасаду прэм'ер-міністра чалавека, які *«знает, что такое нано-, био-, лазерные, фармакологические, космические и другие передовые технологии».* Я не ўпэўнены, што ў свеце можна адшукаць яшчэ аднаго кіраўніка ўрада з такой жа высокай эрудыцыяй. Аднак для выканання якой задачы прызначаны прэм'ер-энцыклапедыст? Цытую: *«Премьер-министр должен прежде всего контролировать выполнение стратегических задач, определенных в программе социально-экономического развития Беларуси на пятилетку».*

Прэм'ер-міністр ва ўмовах вертыкальна арганізаванай эканомікі — гэта кантралёр. Яго папярэдніку, калі ён паспрабаваў нагадаць пра інтарэсы рабочых прадпрыемстваў, адразу ж растлумачылі, што ён *«голый экономист, а не политик»,* а таму абавязаны *«бороться за каждый рубль, каждую копейку».*

Вялікае і складанае сучаснае грамадства не можа доўга функцыянаваць, як яго вертыкальны сярэднявечны папярэднік. Свабодныя ж ад дзяржаўнай апекі асобы здольныя гуртавацца (утварыць нацыю) толькі на падставе гарызантальных сувязяў. Пры гэтым агульны (нацыянальны) інтарэс узнікае як рухомая раўнадзейная інтарэсаў прыватных. Дыялог і з'яўляецца тым механізмам, які дазваляе гэту раўнадзейную ўвесь час выяўляць. Ён не даецца раз і назаўжды.



## Дзе тонка — там і рвецца

Ліміт «каляровых рэвалюцый» і ўзрушэнняў у Беларусі вычарпаны. Пра гэта за апошнім часам беларусам нагадвалі неаднаразова. Я не спецыяліст па Тунісе, але не здзіўлюся, калі і тамтэйшым жыхарам з экранаў тэлевізараў гадамі вяшчалі нешта падобнае. І вось трэба ж! Услед за Тунісам завіраваў Егіпет.

Чытачы «НЧ» будуць здзіўлены, але ўсе пералічаныя падзеі — толькі адна з праяваў сусветнага фінансава-эканамічнага крызісу. Якім чынам амерыканцы спрабуюць утрымаць унутраны попыт, які падае? Яны напампоўваюць эканоміку «пустымі» грашыма. Вялікая частка гэтых грошай урэшце апынаецца на таварных і фондавых рынках. Таму за мінулы неўрадлівы год пры скарачэнні сусветных запасаў пшаніцы на 5% цана на яе падвоілася.

Танная пшаніца — адна з асноўных умоў сацыяльнай стабільнасці для краін, у якіх хлеб з'яўляецца асноўным прадуктам харчавання. Краіны ж Паўночнай Афрыкі знаходзяцца ў групе сусветных лідараў па імпарце пшаніцы на душу насельніцтва. Напрыклад, Егіпет, спажываючы ў год каля 14 мільёнаў тон пшаніцы, імпартуе 7,5 мільёна тон.

Летась на вуліцы французскіх гарадоў адначасова павыходзілі мільёны дэманстрантаў, але да «фіялкавай» рэвалюцыі гэта не прывяло. Мільёны выказалі свой пратэст з нагоды пенсійнай рэформы і мірна разышліся па хатах. Не выключана, што пратэстная актыўнасць 2010 года яшчэ адгукнецца прэзідэнту Сarказі на найбліжэйшых выбарах, аднак гэта будзе выключна яго асабістай праблемай і праблемай яго жонкі Карлы. На нацыянальных інтарэсах Францыі гэта не адаб'ецца. Выбары (муніцыпальныя, парламенцкія, прэзідэнцкія) — толькі адна, але надзвычай важная форма палітычнага дыялогу, і выключна там, дзе іх вынік непрадказальны, выбары не расколваюць, а гуртуюць нацыю.

## Паводле армейскай мадэлі

Быць сябрам якой-небудзь сацыяльнай групы — значыць мець права голасу ў дыялогу наконт яе будучыні. У другім туры прэзідэнцкіх выбараў у Польшчы пераможцу, Браніслава Камароўскага, падтрымалі 53,01% выбарцаў, а яго апанента Яраслава Качыньскага — 46,99%. Пры жаданні, за гэтай электаральнай арыфметыкай можна ўбачыць раскол у польскім грамадстве.

Але ці можна ўявіць сабе прэзідэнта Камароўскага, які разважае пра правы меншасці мець *«свою точку зрения»?* Польская меншасць з'яўляецца неад'емнай часткай грамадства не таму, што кіраўнік дзяржавы ў сілу нейкіх чыннікаў раптам вырашыў так яго ўспрымаць. Права кожнага паляка браць удзел у дыялогу пра будучыню Польшчы запісана ў Канстытуцыі, і палякі маюць рэальныя магчымасці гэта права рэалізаваць, у тым ліку і праз выбары.

Няма нічога дзіўнага ў тым, што амаль палова палякаў не задаволеныя вынікамі прэзідэнцкіх выбараў, але прэтэнзій да падліку галасоў прадстаўнікі меншасці не выказалі. Чаго не скажаш пра беларусаў (глядзі табліцу). Па меркаванні кожнага трэцяга, снежаньскія выбары не былі свабоднымі і справядлівымі.

Вайна, як вядома, — працяг палітыкі іншымі сродкамі. Палітыка, у сваю чаргу, з'яўляецца спосабам узгаднення інтарэсаў. Злучэнне дзвюх азбуковых ісцін разам дазваляе нам паглядзець на вайну як на дыялог, у якім адзін з бакоў навязвае сваю праўду сілай. У гэтым сэнсе рэвалюцыя ёсць спосаб уключэння ў дыялог пра будучыню краіны грамадзян, пазбаўленых уладай палітычных правоў.

Беларускае грамадства — аскепак імперскага грамадства (савецкага і дасавецкага), яно працяглы час фармавалася па мадэлі арміі ва ўмовах «крэпасці ў аблозе», таму знаходжанне ў апазіцыі да ўлады ў нас стагоддзямі разглядалася як здрада, як ваенная здрада. «Калі ж, — на думку палітолага Ігара Клямкіна, — кіраўніцтва пад уздзеяннем тых ці іншых выклікаў пачынае мілітарызацыю паслабляць, высвятляецца, што да іншай, неваеннай, арганізацыі не гатовыя ні эліты, ні насельніцтва. Што ніякага іншага ўяўлення пра агульны інтарэс, акрамя вайсковага, у іх свядомасці няма».

У Беларусі ўсе паверхі ўладнай «вертыкалі» занятыя дарослымі маніхеямі. Калі яны і гатовыя весці дыялог з кім б там ні было (Захадам, Расіяй, апазіцыяй), то выключна на сваёй тэрыторыі, г. зн. пры ўмове прызнання за імі манапольнага права на выказванне агульнанацыянальнага інтарэсу.

Але і за межамі ўладнай вертыкалі маніхеяў хапае. Паводле снежаньскага апытання НІСЭПД, 18% беларусаў лічаць, што ў склад выбарчых камісій павінны ўваходзіць толькі тыя асобы, якія адстойваюць інтарэсы дзеючай улады. Хапае маніхеяў і сярод апазіцыі, інакш як растлумачыць няздольнасць партыйцаў весці канструктыўны дыялог паміж сабой? Мы ўжо прызвычаіліся, што асноўныя інфармацыйныя нагоды, якія генеруюцца партыйнымі штабамі, звязаныя з бясконцымі разборкамі за манапалізацыю права прадстаўляць інтарэсы «нашых».

## Тэлефанаванне ідэолагу

Афіцыйны падзел грамадства на «большасць» і «меншасць» паставіў пад сумнеў узровень усебеларускасці IV Усебеларускага народнага сходу (УНС). Каб пазбавіцца сумневу, я патэлефанаваў начальніку галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай працы Мінгарвыканкама Сяргею Хільману.

Галоўны гарадскі ідэолаг майго сумневу не зразумеў. Ён растлумачыў, што «большасць» і «меншасць» былі зафіксаваныя ЦВК падчас галасавання, дэлегатаў жа на IV УНС выбіралі ад працоўных калектываў на тры тыдні раней.

Лепшай ілюстрацыі да беларускага сярэднявечча цяжка і ўявіць. Я па наіўнасці разглядаў IV УНС у якасці палітычнага органа, рэальны ж яго статут — сход прадстаўнікоў прафесійных саслоўяў. Прызнаюся, я не меў рацыі, калі іранізаваў з нагоды надання IV УНС статусу «ўсенароднага веча». Веча палітычным органам не з'яўлялася ўжо хаця б таму, што ў вертыкальна арганізаваным сярэднявечным грамадстве няма месца для палітыкі.

ЯК ВЫ ЛІЧЫЦЕ, ЦІ БЫЛІ ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА БЕЛАРУСІ СВАБОДНЫМІ І СПРАВЯДЛІВЫМІ? (У ПРАЦЭНТАХ АД УСІХ АПЫТАНЫХ)*

| Варыянт адказу | красавік 2006 | снежань 2010 | Давяраюць Лукашэнку | Не давяраюць Лукашэнку |
|---|---|---|---|---|
| Так | 61 | 55 | 83 | 12 |
| Не | 27 | 32 | 8 | 74 |
| Цяжка адказаць/ Няма адказу | 12 | 13 | 8 | 14 |

* Паводле дадзеных НІСЭПД

МЕРКАВАННЕ

# Уладзімір Роўда: КРЭМЛЬ ВЕДАЎ ПРА СІЛАВЫ СЦЭНАР

**Рада міністраў замежных спраў краін Еўрасаюза на пасяджэнні ў Брусэлі 31 студзеня прыняла палітычнае рашэнне наконт рэакцыі ЕС на сітуацыю ў Беларусі. Палітвязні, санкцыі, гандаль — ланцужок знаёмы. Затрыманых 19 снежня 2010 года пачалі выпускаць пад падпіску аб нявыездзе ці хатні арышт. Ці сапраўды Еўропа напалохала беларускі рэжым санкцыямі? Журналіст «НЧ» Вольга Хвоін размаўляе з палітолагам Уладзімірам РОЎДАМ.**

***— Ці можна лічыць, што апазіцыя, міжнародная супольнасць усё ж дамагліся саступак з боку Лукашэнкі?***

— Трэба называць рэчы сваімі імёнамі. Мусяць быць спыненыя крымінальныя справы, трэба адмовіцца ад спробы прыцягнуць палітыкаў да адказнасці па артыкулу аб арганізацыі масавых беспарадкаў, за што ім пагражае ад пяці да пятнаццаці гадоў турмы. Падпіска аб нявыездзе нічым не адрозніваецца ад таго, калі людзі знаходзяцца ў камеры. Я не называю гэта саступкамі, бо тое — псеўдасаступкі, звязаныя з тым, што 31 студзеня гэтае пытанне разглядалася ў Брусэлі, збіралася Рада міністраў замежных спраў краін ЕС і прымалася канчатковае рашэнне аб санкцыях. Лукашэнка хацеў залагодзіць еўрапейскую публіку.

Нядаўняе з'яўленне Макея ў Літве, думаю, таксама звязана з гэтымі падзеямі. Да таго ж пазіцыя Літвы адрозніваецца ад пазіцый іншых краін Еўрасаюза. Кіраўніцтва Літвы зацікаўленае ў працягу супрацоўніцтва з Рэспублікай Беларусь, нават з тым рэжымам, які трымае палітвязняў, яны хацелі б весці перамовы. Літва вельмі зацікаўленая, каб былі рэалізаваныя літоўска-беларускія праекты, звязаныя з цэлым шэрагам галінаў. Напрыклад, пастаўка нафты праз клайпедскі порт.

***— Апазіцыя паверыла ў намеры лібералізаваць палітычную сістэму. Весціся на гульню Лукашэнкі — крытычная памылка?***

— Не ўся апазіцыя павялася. Тыя, хто павёўся, — рух «За свабоду» і Аляксандр Мілінкевіч, які ў Брусэлі дакладваў, што ў нас ідзе лібералізацыя, што нават у кепскіх умовах мы мусім падштурхоўваць рэжым у бок рэформаў і што гэта магчыма зрабіць. Фактычна ён падманваў чыноўнікаў Еўрасаюза. Бо тады выпусцілі Казуліна, парачку моладзевых актывістаў, зарэгістравалі рух «За свабоду», на гэтым лібералізацыя скончылася. Калі казаць пра іншых, хто павёўся на новы вобраз беларускага рэжыму, — партыя БНФ, яе новае кіраўніцтва. Там цяпер увогуле адбываецца поўная дэградацыя, партыя згубіла шмат пазітыўных якасцяў. Яшчэ ў ліку аматараў лібералізацыі аказаўся палітык Алесь Міхалевіч. Ён цяпер знаходзіцца ў турме і можа паглядзець бліжэй на твар лібералізацыі.

Улады хацелі, каб беларуская апазіцыя гуляла ў так званы плюралізм. Каб было як мага больш кандыдатаў. Я ўпэўнены, што ніхто з іх, апроч Някляева і Саннікава, подпісы не сабраў, бо каманды папросту не былі гатовыя. Гэта гульня на Еўропу, еўрапейскіх палітыкаў — глядзіце, які ў нас каласальны прагрэс, палітычны плюралізм! Лукашэнка разумеў, што за тры месяцы змяніць сітуацыю немагчыма. Гэтая гульня ў плюралізм была яму на карысць — паказаць для Еўропы спектакль, ён не збіраўся лічыць галасы і, канешне, спадзяваўся, што на гэтых выбарах набярэ, думаю, каля 80 працэнтаў. Лукашэнка лічыць сябе вельмі папулярным, а тое, што адбылося, што паказваюць сацыёлагі, — для яго катастрофа. Хто вінаваты ў такой сітуацыі? Не Лукашэнка ж, а «праклятыя апазіцыянеры, якія зрабілі змову з палякамі і немцамі». І сілавыя структуры зразумелі, што яны наверсе, мусілі гуляць гэтую карту. Іншых варыянтаў не было, Еўропа ўсё адно не прызнала б гэтых выбараў.

***— Як бы вы спрагназавалі палітычную будучыню Яраслава Раманчука, Андрэя Дзмітрыева, якія выступілі з заявамі, што дыскрэдытуюць іх паплечнікаў, выглядаюць здрадай?***

— Раманчук і Дзмітрыеў — розныя постаці, і лёс іх будзе розным. Прызнанні Дзмітрыева выглядалі непераканаўча, іх можна патлумачыць ціскам. Нашы "органы" працуюць па метаду Вышынскага, які казаў, што «прызнанне — цар доказу». Думаю, Дзмітрыеў зможа вярнуцца ў апазіцыю. З Раманчуком справа іншая. Для мяне было нечакана, калі Яраслаў Раманчук зрабіўся кандыдатам ад Аб'яднанай грамадзянскай партыі, у яго была непрафесійная кампанія ў агітацыйнай часткі. Ён рабіў заявы, што за яго гатовы прагаласаваць увесь апазіцыйны электарат, а праз тры месяцы працы — будзе палова галасоў. Няўжо гэта прафесійны разлік сваіх магчымасцяў? Трэба найперш разумець, у якіх умовах ты працуеш. У дзень выбараў ён падпісвае паперу, што з іншымі кандыдатамі ўваходзіць ва «ўрад народнага выратавання». У яго былі намеры стаць прэм'ер-міністрам. Добра, што яны не спраўдзіліся, бо гэта быў бы той яшчэ хлопчык. Потым ён адмовіўся ісці на плошчу Незалежнасці, бо, мяркую, ведаў пра правакацыі. Але з той колькасцю сілавікоў правакацыі маглі б быць і на Кастрычніцкай плошчы, тым больш, там быў каток, на якім людзям сабрацца было цяжка. Сцэнар з паходам да ЦВК быў, папярэдне была вулічная акцыя з «рэпетыцыяй». І Раманчук мусіў ці ад пачатку дзейнічаць скаардынавана з іншымі кандыдатамі ў прэзідэнты ці, як казала Ярмошына, «варыць боршч, а не шастаць па плошчах». А заставацца на Кастрычніцкай плошчы і чакаць, пакуль АМАП пачне разганяць на лёдзе — гэта поўная параза.



Уладзімір Роўда

***— Які ваш прагноз знешнепалітычных адносінаў Беларусі на бліжэйшы час?***

— У Лукашэнкі ўсё ж не вельмі вялікі выбар супрацы ў знешнепалітычных вектарах. У яго сябра Уга Чавеса цяпер не самая лепшая сітуацыя — трэба кідаць грошы на выпраўленне наступстваў прыродных катаклізмаў. Іранскі рэжым таксама губляе ўнутраную падтрымку, трапляе ў ізаляцыю, і яму трэба думаць пра сябе. Кітай — аддаленая перспектыва, і ён не прыйдзе сюды наўпрост, без расійскага дазволу, бо іх найперш цікавіць Расія. Да таго ж кітайская падтрымка абумоўленая пэўнымі пунктамі — мы будуем цэментны завод, але працаваць будуць кітайскія рабочыя. Беларусам гэта не трэба. Застаецца Расія. Больш таго, яна спрычынілася да чацвёртага тэрміну Лукашэнкі, бо перад выбарамі былі падпісаны цэлы шэраг пагадненняў, якія не надта выгодныя Беларусі. Крэмль ведаў пра сілавы сцэнар падзей 19-га снежня і даў дазвол. Такія рэчы не адбываюцца без ведама Расіі. Беларусь цяпер шукае ворагаў у Польшчы, Германіі, абсякае перспектыўныя кантакты. Гэта выгодна Расіі, бо нам застаецца варыянт ісці на паклон да Пуціна—Мядзведзева. Нават калі захаваем незалежнасць, моцна пацерпім з-за няроўных эканамічных умоў. Трэба чакаць прыватызацыю з удзелам расійскага капіталу, таму і Мясніковіч стаў прэм'ерам, бо ён добра ведае людзей, якія ў гэтым зацікаўленыя. Плюс трэба аддаваць крэдыты. І Лукашэнку было б выгодна працягваць гульню ў лібералізацыю, прыцягваць сюды грошы з Захаду. Думаю, гэта была ідэя Макея, але цяпер галоўны гулец не ён, а сілавікі. Маю на ўвазе найперш КДБ. Іх сцэнар быў надрукаваны ў «Советской Белоруссии», на падставе гэтага сцэнару быў даклад Лукашэнкі. І вось на падставе гэтых непісьменных матэрыялаў мы будуем сваю знешнюю палітыку, у гэтым палягае жахлівасць сітуацыі.

***— Ці магчыма, што праз некалькі месяцаў еўрапейскія чыноўнікі скажуць, што сістэма санкцый не працуе, і таму трэба вяртацца да дыялогу?***

— Ніколі ў іх не было максімальных санкцый, згоды паміж краінамі. Іншая справа, як будуць яны гэта выконваць. Ёсць досвед такіх санкцый, адрасных, — амерыканскі досвед. Яны маглі б павучыцца ў Штатаў і разам з імі нешта зрабіць. Я не выключаю, што Еўрасаюз можа пайсці на саступкі, і Лукашэнка гэта цудоўна разумее. Да Еўропы ён ставіцца вельмі скептычна, да іх санкцый, іх адзінства. ЕС трэба было б, безумоўна, «біць» па «Белнафтахіму» разам з амерыканцамі.

***— Цяпер апазіцыя засяродзілася на вызваленні палітвязняў. Але для пераважнай большасці беларусаў гэта не надта актуальна. Натуральна, трэба дамагацца вызвалення гэтых людзей, але, можа, варта было б і ў іншых кірунках працаваць?***

— Палітвязні мусяць стаяць на першым месцы. Калі гаварыць пра інтарэсы грамадства і працяг паспяховых элементаў стратэгій некаторых кандыдатаў — маю на ўвазе найперш праграму Някляева, то цяпер гэта папросту няма каму рэалізоўваць. Саннікаў у турме, Някляеў пад хатнім арыштам. Апазіцыю абезгаловілі, і без вызвалення гэтых людзей наўрад ці атрымаецца рабіць нешта сур'ёзнае. Іншая справа, што Лукашэнка будзе трымаць іх да таго часу, пакуль яму не будзе выгодна адпусціць. Гэта жахлівы гандаль жывым таварам. Не выключаю, што Еўропа пачне прапаноўваць варыянты: вы выпускаеце чалавека і атрымаеце крэдыт. І Лукашэнка гэтым з задавальненнем скарыстаецца.

***— Пра раскол беларускага грамадства гавораць даўно, пасля гэтых выбараў ён быццам бы павялічыўся.***

— У прынцыпе, ёсць каласальны раскол каштоўнасцяў, людзі не разумеюць адзін аднаго — тое, што пераадолець вельмі складана. Вось Някляеў спрабаваў гэта зрабіць, гэта добра — не адштурхоўваць простых людзей, на іх мове гаварыць пра праблемы, пра шляхі іх вырашэння. Разрыў паміж Мінскам і рэгіёнамі вядзе да таго, што ствараецца міна запаволенага дзеяння. У рэгіёнах сітуацыя пагаршаецца. Яны выжываюць толькі таму, што ёсць магчымасць працаваць за мяжой — у Расіі і г. д. Можна было б аб'яднаць у будучым гэты пратэстны патэнцыял Мінска, з пратэстным патэнцыялам вёсак, маленькіх гарадоў. Але ён пакуль не артыкуляваны. Думаю, сацыяльнага выбуху давядзецца чакаць не доўга. Беларусы вельмі адгукаюцца менавіта на сацыяльна-эканамічныя праблемы — зніжэнне заробкаў, немагчымасць набыць нармальныя тавары за прымальныя кошты. Еўрасаюзу трэба здымаць візы для беларусаў, даваць магчымасць людзям ездзіць у Еўропу, там вучыцца, працаваць.

***— Магчыма, мы яшчэ не заслужылі, не аплацілі права на незалежнасць, самавітасць, павагу да сябе, права называцца нацыяй?***

— У нас ёсць агульныя нацыянальныя інтарэсы, іншая справа, што нацыя знаходзіцца ў неразвітым стане. Культура падзяляецца на рускамоўную, што актыўна прапагандуецца ўладамі, і беларускую, якая ў вачах Лукашэнкі няякасная. Палітычныя ўлады не падтрымліваюць тытульную нацыю, гэта нонсенс. Лукашэнка, відаць, яшчэ марыць пагуляцца ў расійскую карту, зацікаўлены ў падтрымцы Расіяй самага прарасійскага, адданага прэзідэнта.

***— Ці не падаецца, што пасля падзей 19 снежня, пасля стольківх гадоў знаходжання аднаго чалавека ва ўладзе, панятак беларускай талерантнасці дыскрэдытаваны?***

— У нас няправільнае разуменне талерантнасці, якое ўлады перавярнулі ў бок панящце цярпення, спакою. Гэта не талерантнасць. Бо яна насамрэч будуецца на самапавазе. Я буду талерантны да іншага, калі ён паважае мяне, мае думкі, погляды, ідэі. У нас жа талерантнасць — гэта стабільнасць, захаванне ўлады ў адных руках.

ТРЭЦІ СЕКТАР

# АЛЕНА ТАНКАЧОВА

Аляксандр ТАМКОВІЧ



**Шчыра кажучы, назіраючы за актыўнасцю Алены Танкачовай пасля падзей 19 снежня 2010 года, я меркаваў, што яна належыць да якой-небудзь канкрэтнай палітычнай плыні. І ў гэтым яшчэ больш упэўніўся пасля праведзенага міліцыяй і КДБператрусу ў яе кватэры. Аказалася — памыліўся. Праваабаронцаў сёння «прэсуюць» для таго, каб было лягчэй «прэсаваць» іншых…**

## Новы колер

Пачаць хочацца менавіта з фарбаў нябёсаў, якія з самага нараджэння (10 лютага 1970 года) для Алены Танкачовай сталі чымсьці большым, чым «шосты акіян». Той акіян быў роднай стыхіяй яе бацькі, які служыў у марской авіяцыі.

Барыс Васільевіч Танкачоў калісьці лічыўся адным з лепшых экспертаў па вайскова-авіяцыйных катастрофах і выйшаў на пенсію з пасады галоўнага інжынера авіяцыі Балтыйскага флоту.

Зразумела, што хоць і нарадзілася Алена Танкачова ў Калузе, геаграфію былога Савецкага Саюза яна пачала вывучаць з дапамогай не падручнікаў, а звычайных для ваенных пераездаў. Напрыклад, за час руху да атэстата аб сярэдняй адукацыі, ёй давялося змяніць аж сем школаў.

Апошняй з іх стала сярэдняя школа №3 беларускага горада Быхава. Многія ведалі, што падчас першай сусветнай вайны там была стаўка вярхоўнага галоўнакамандуючага, але далёка не ўсе ведалі, што менавіта там у савецкія часы месцілася дывізія марской авіяцыі Балтыйскага флоту. Праз паўгадзіны самалёты ўжо маглі выконваць «баявыя задачы» над морам. Іншая справа — наколькі ўсё гэта было мэтазгодна.

Можа, з тых крыніц і паходзяць спробы сучасных уладаў зрабіць нашу краіну «марской». Падставы ў іх, сапраўды, ёсць. Не хапае толькі здаровага сэнсу. Інакш бы «на версе» зразумелі, што нельга калькаваць усе хібы савецкіх часоў на нашу суверэнную рэчаіснасць. Вялікае Княства Літоўскае таксама некалі мела выхад да Чорнага мора, але ні ў каго сёння не ўзнікае нейкіх «чарнаморскіх» амбіцый.

Менавіта ў Быхаў і прыехаў пасля вучобы ў ад'юнктуры акадэміі імя Жукоўскага, якую скончыў з залатым медалём, бацька Алены Танкачовай. Яму прапаноўвалі застацца на кафедры і выкладаць, але Барыс Васільевіч заўсёды быў прыхільнікам не тэорыі, а практыкі. Пагадзіцеся, далёка не кожны чалавек, выбіраючы паміж сталіцай СССР і беларускай правінцыяй, можа аддаць перавагу апошняй.

Маці Алены, Галіна Уладзіміраўна Танкачова, была класічнай жонкай савецкага афіцэра, то бок «працавала» хатняй гаспадыняй. Дарэчы, у тыя часы яны яшчэ не глядзелі бясконцых тэлевізійных серыялаў. І зусім не таму, што тых яшчэ не існавала ўвогуле. Прычына іншая — не хапала вольнага часу.

## Новыя нечаканасці

У Быхаве прайшлі два апошнія школьныя гады Алены Танкачовай. Канешне, розніца паміж маскоўскім узроўнем і «быхаўскім» адчувалася, але ў яе сям'і на гэта ніколі не звярталі ўвагі, таму комплексу «столичной штучки» ў дзяўчынкі не было. Як вядома, адна справа, як да гэтага ставішся ты, і зусім другая — іншыя.

У 1985 годзе ў Беларусі яшчэ насілі традыцыйную карычневую школьную форму, а ў Маскве ўжо можна было апранацца на свой густ. У Алены быў прыгожы сіні касцюм, аднак ужо праз два тыдні ёй «падказалі», што трэба апранацца «як усе».

Вяртацца ў мінулае ёй не хацелася, і тут на дапамогу прыйшла маці, якая сама з карычневай тканіны пашыла для дачкі прыгожую сукенку. З аднаго боку, яна адпавядала тагачаснаму дрэс-коду, з другога — была «не з крамы». Словам, выйсце знайшлі, што красамоўна тлумачыць, чаму жонак вайскоўцаў тады называлі надзейным «тылам».

У наступным годзе выбухнула Чарнобыльская атамная станцыя. Калі ўлічваць, што ў дывізіі было цэлае падраздзяленне «хімікаў», а на самалётах стаялі ракеты з ядзернымі боегалоўкамі, то вайскоўцы добра разумелі, што адбылося, аднак… ніхто з іх не з'ехаў. Больш за тое, у святочных майскіх мерапрыемствах тады прыняў удзел увесь гарнізон (з сем'ямі і дзецьмі).

Чаму? Адказ на гэтае пытанне ад свайго бацькі Алена Танкачова пачула значна пазней. Не хаваючы горычы, ён патлумачыў — жорсткі загад. Начальства баялася, каб сярод мясцовых жыхароў не пачалася паніка.

Апошнім месцам яго службы быў Калінінград, дзе месціўся штаб Балтыйскага флоту СССР. Пасада была генеральскай, але, каб атрымаць «лампасы», трэба было зноў ехаць у Маскву. Рабіць гэтага бацька Алены не хацеў, бо лічыў службовую кар'еру не самым галоўным у жыцці.

У сям'і Танкачовых былі даволі розныя ўяўленні наконт таго, якую прафесію трэба абраць Алене. «Кампрамісам» стала журналістыка, бо ў дзяўчынкі ўжо былі публікацыі ў мясцовай раёнцы. Рэкамендацыю для паступлення ёй далі без праблем.

На факультэт журналістыкі БДУ Алену Танкачову бацькі і прывезлі. Але, як толькі яны з'ехалі, Алена самастойна забрала дакументы з журфаку і аддала іх на другі факультэт — гістарычны. Ён падабаўся болей. Далей усё адбылося, як у жудасным сне. На першым жа ўступным экзамене (абсалютна нечакана для сябе) Алена Танкачова атрымала «два»…

## Новы накірунак

Тое, што яна тады перажывала, нават цяжка ўявіць. Пакаяцца перад бацькамі было амаль немагчымым, бо рашэнне прымалася самастойна, і цалкам насуперак іх прыярытэтам. Напрыклад, Барыс Васільевіч выступаў катэгарычна супраць «гістарычнага» выбару, бо добра ведаў, што выраблялa з гісторыяй савецкая ідэалогія.

Алена Танкачова пачала шукаць варыянты працягу вучобы і спынілася на юрыдычным аддзяленні тэхнікума савецкага гандлю. Так лёс накіраваў яе да тых арыенціраў, якія потым стануць самымі галоўнымі ў жыцці.

Вучоба ў тэхнікуме азначала, што праз два гады можна было стаць, скажам так, «юрыстам сярэдняга звяна». Напрыклад, працаваць у канцылярыі нейкага суда альбо юрысконсультам на прадпрыемстве. Зразумела, што паступіць туды (маючы школьны «срэбны» медаль) было нескладана. І толькі пасля гэтага Алена Танкачова пра ўсё расказала сваім бацькам.

Тэхнікум яна скончыла з «чырвоным» дыпломам і адразу пайшла на юрыдычны факультэт БДУ. Цікава, што разам з ёй адзін час вучылася будучы намеснік прэзідэнцкай адміністрацыі Наталля Пяткевіч. А адзін з іспытаў на першым курсе прымаў Рыгор Васілевіч. Той самы, што сёння ўзначальвае Генеральную пракуратуру і вельмі своеасабліва абараняе прыярытэты законнасці.

Дарэчы, сярод яе універсітэцкіх выкладчыкаў былі прафесар Іосіф Аляксандравіч Юхо, які адзіны на юрфаку выкладаў на беларускай мове, а таксама Ала Анатольеўна Сакалова, якая зараз вучыць студэнтаў Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта. Менавіта ім у першую чаргу Алена Танкачова і ўдзячная за разуменне філасофіі юрыспрудэнцыі.

У нейкім сэнсе ёй пашанцавала. Алена Танкачова вучылася тады, калі на юрфаку запанаваў дух свабоды, а сама навука пазбавілася савецкіх ідэалагічных аковаў. Адным з яе любімых прадметаў было канстытуцыйнае права. Пасля сканчэння БДУ яна нават зрабіла спробу пайсці ў аспірантуру на адпаведную кафедру, але… Адбыўся рэферэндум лістапада 1996 года, і галоўны закон краіны быў зменены больш чым радыкальна. Стала зразумела, што ў юрыспрудэнцыю зноў вяртаецца ідэалогія.

## Новы шлях

Даволі сімвалічна, але менавіта дзякуючы гэтай спробе Алена Танкачова і стала цікавіцца той справай, якой займаецца зараз. Маецца на ўвазе трэці сектар, бо тэмай яе ненапісанай дысертацыі якраз і былі грамадскія арганізацыі.

Яе асабістым дэбютам стала стварэнне ў 1996 годзе Незалежнага таварыства прававых даследаванняў, якое ў 2004 годзе было прымусова ліквідавана беларускім міністэрствам юстыцыі. Можа, супадзенне, аднак сам працэс ліквідацыя адбыўся пасля таго, як гэтая структура паўдзельнічала ў больш чым 50-ці судовых спрэчках, адносна закрытых Мінюстам грамадскіх арганізацый. Думаю, многія памятаюць масавую зачыстку трэцяга сектара, што адбылася пасля прэзідэнцкіх выбараў 2001 года.

Паплечнікам Танкачовай далі зразумець, што ў патэнцыйных спробах зарэгістраваць новую грамадскую арганізацыю ніякіх шансаў няма, таму было прынята рашэнне перайсці да фармату работы фонду. Так з'явіўся Інавацыйны фонд прававых тэхналогіяў.

Да былых вузкапрафесійных мэтаў (работа ў судах) дадаліся новыя накірункі дзейнасці — прававой дапамогі, судова-прававой рэформы, доступу да інфармацыі, праваабарончай дзейнасці. Такім чынам, эфект атрымаўся супрацьлеглым таму, чаго нехта чакаў ад ліквідацыі іх структуры.

У дзейнасці Алены Танкачовай з калегамі з'явіліся і дадатковыя кампаненты. Маецца на ўвазе актуальная выдавецкая праграма, скіраваная на распаўсюджванне стандартаў у галіне правоў чалавека. Нягледзячы на ўсе складанасці, выдадзеная імі літаратура сёння знаходзіцца ў кожнай бібліятэцы кожнага юрфаку Беларусі. Дадаць да гэтага можна і двухтыднёвы трэнінг для студэнтаў юрыдычных факультэтаў па правах чалавека, які шмат гадоў праходзіў у Германіі.

Зразумела, што гэта не магло падабацца нашай дзяржаве, і ў 2006 годзе іх таксама закрылі. Не ведаю, хто канкрэтна «наверсе» памылкова лічыць, што, каб спыніць работу людзей, дастаткова ліквідаваць структуру, якая афіцыйна іх аб'ядноўвае. Каб было так проста, то любое іншадумства ў нашай краіне было б ужо выкарчавана яшчэ гадоў пяць таму. І не было б каму рэгістравацца ў Чэхіі альбо Украіне.

Дарэчы, менавіта ўкраінскія сябры прапанавалі Алене Танкачовай зарэгістравацца ў іх краіне. Так узнік Фонд развіцця правых тэхналогіяў, якому ўрэшце ўдалося атрымаць рэгістрацыйнае пасведчанне і ў Беларусі. Сёння іх назва — Учреждение «Центр правовых трансформаций».

Тое што, адбылося пасля мінулых прэзідэнцкіх выбараў, яшчэ доўга будзе знаходзіцца ў фокусе ўвагі не толькі юрыстаў, але і псіхіятраў, таму зараз не будзем прыцягваць да гэтага вашу ўвагу. Адзначым толькі, што хваля рэпрэсій па вызначэнню не магла абысці і Алену Танкачову.

29 снежня 2010 года яе запрасілі на допыт у КДБ, а потым быў ужо традыцыйны ператрус. Забралі нават тое, што ніякім чынам не мела адносін да падзей 19 снежня. Мабыць, звычка «хапаць» усё без разбору для некаторых стала жыццёвым інстынктам.

Прыналежнасць да трэцяга сектару пры неабходнасці дае магчымасць пераканаўча абысці жорсткую партыйную дысцыпліну. Напрыклад, падчас апошніх прэзідэнцкіх выбараў Алена Танкачова тройчы атрымлівала прапановы аб рабоце ад выбарчых штабаў трох розных кандыдатаў. Тройчы адмовілася, матывуючы гэта тым, што незалежнай яна ўсім будзе больш карыснай. А вось тыя, хто мае партыйныя білеты, так зрабіць не змаглі. Не адзін раз мне даводзілася чуць амаль рэфрэн: «Партыя сказала — трэба».

Зразумела, Алене Танкачовай такога не скажаш. Больш за тое, яна нават гатовая выступіць супраць цяперашніх апазіцыянераў, калі яны, дамогшыся ўлады, будуць таксама парушаць правы чалавека. Асабіста мне падобны падыход вельмі падабаецца, бо так яно і павінна быць па вызначэнню.

7

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ TV

## 7 ЛЮТАГА, ПАНЯДЗЕЛАК

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 22.45** Навіны.
**06.05, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45** Nota Bene.
**07.05, 08.10, 18.50, 00.40** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** «У свеце матораў».
**09.10** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**10.10** Здароўе.
**10.35** Культурныя людзі.
**11.05** Крымінальная меладрама «Зацьмненне» (Расія - Украіна).
**12.10** Трагікамедыя «Нябёсы запаветныя».
**14.30** Дакументальны фільм «Унікальны помнік чалавечай веры».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.40** «OFF STAGE LIFE».
**16.05** Nota Bene.
**16.30** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.20** Крымінальная меладрама «Зацьмненне» (Расія - Украіна).
**18.25** Праграма «Акно ў Еўропу».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Арэна». Праграма аб спорце.
**19.55** Ход у адказ.
**21.00** «Панарама».
**21.45** Дэтэктыўны серыял «Абдуры мяне».
**22.55** Баявік «Руслан» (ЗША-Канада).
**00.45** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.05** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Тата на ўсе рукі». Камедыйны серыял.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Зваротны адлік».
**18.55** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Адкрыты фармат».
**22.05** «Галасы». Заключная серыя.
**23.20** Навіны спорту.
**23.25** «Ралан Быкаў. "Я вас, дурняў, не кіну…"».
**00.25** «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**01.15** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** «Тыдзень».
**09.35** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Пяць гісторый».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Фантастыка пад грыфам «Сакрэтна».
**13.50** «Зорны рынг».
**15.00** Канцэрт М.Задорнава.
**16.00** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**16.50** «Рэпарцёрскія гісторыі».
**17.10** «Наша справа».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Дарослыя гульні». Серыял. Заключная серыя.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Ягорына гора». Расія, 2008г.
**22.55** «Сталічны футбол».
**23.25** Фільм «Дурняў няма». ЗША, 1994г.

---

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**08.55** Серыял «Ты маё жыццё».
**10.00** Сямейная меладрама «Маляня і Богіс» (ЗША).
**11.55** Пра мастацтва.
**12.25** Школа рамонту.
**13.20** Прыгодніцкая меладрама «Зямля святла» (Францыя-Бельгія).
**14.15** Серыял «Сіла прыцягнення».
**15.10** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**15.35** Пазакласная гадзіна.
**15.50** Тэлебарометр.
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.55** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**18.00** Серыял «Ты маё жыццё».
**19.05** «Дон Сезар дэ Базан». Музычная камедыя (СССР). 1-я серыя.
**20.30** Калыханка.
**20.45** Тэлебарометр.
**20.50** Беларуская часіна.
**21.50** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.25** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**23.00** Авертайм.
**23.30** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**00.20** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

---

РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.00** «Карціна свету».
**09.55** Надвор'е на тыдзень.
**10.00** «Гарадок».
**10.20** «Ранішняя пошта».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**12.20** «Кулагін і партнёры».
**12.50** «Пакой смеху».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Рускі шакалад». Тэлесерыял.
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Цуд».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Класныя мужыкі».
**22.20** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** «Нічога асабістага». І
**23.35** Навіны - Беларусь.
**23.45** «Весткі.ru».
**00.00** «Дзяжурны па краіне».

---

НТВ

**06.05, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**06.10** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** Серыял «Таксістка».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «Кулінарны паядынак».
**11.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**12.05** «Да суду».
**13.30** Серыял «Ментоўскія войны».
**15.15** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.25** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Бывай, «Макараў»!».
**21.30** Прэм'ера. Баявік «Святаннік».
**23.40** «Сумленны пандзелак».
**00.30** Серыял «Чужы твар».

---

EUROSPORT

**09.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Хінтэрстодэр). Мужчыны. Слалам-гігант. 2-я спроба.
**10.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Расіі (Рыбінск). Мужчыны. 4х10 км.
**11.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Расіі (Рыбінск). Жанчыны. 4х5 км.
**12.00, 17.00** Біятлон. Кубак свету ў ЗША (Прэск-Айл). Мужчыны. Гонка пераследу.
**12.30, 17.30** Біятлон. Кубак свету ў ЗША (Прэск-Айл). Жанчыны. Гонка пераследу.
**13.00, 18.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Германіі. Каманды. HS 213.
**14.00** Шары (Боўлінг). Адкрыты чэмпіянат Уэльса (Ланэлі, Вялікабрытанія). Фінал.
**15.00, 00.45** Снукер. Германія Мастэрс (Берлін). Фінал.
**19.15, 21.30, 23.30** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.30** Футбол. Эўра-2012. Таварыскі матч.
**20.30** Самыя моцныя людзі планеты. Турнір «Giants Live» (Кіеў, Украіна).
**21.50** Вось дык так!!!
**22.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE.
**22.30** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**23.45** Футбол. Эўра-2012. Таварыскі матч.

---

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**07.30** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**07.45, 12.15** Эксперт.
**08.10, 12.40** ПраСвет.
**08.35** Прыватная калекцыя.
**09.05, 14.05** Дак. гадзіна: «Чацвёртая сусветная вайна», дак. фільм, 2003 г., ЗША.
**10.20, 15.20, 21.45** Фільматэка майстроў: «Сонечная дзяржава», маст. фільм, Чэхія.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.05** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**13.05** Басаном па свеце.
**13.30** Прыватная калекцыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Мой родны горад», серыял.
**17.30** «Час гонару», серыял: 15 серыя.
**18.20** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**18.40** Госць «Белсату».
**18.55** Невядомая Беларусь: «Еўрапейскі баль», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.35** Гарачы каментар.
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Еўропа сёння.
**20.20** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Барбара Радзівіл і Жыгімонт Аўгуст».
**20.35** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Валянцін Тарас», дак. фільм, Беларусь.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**23.20** Аб'ектыў.
**23.40** Гарачы каментар.

## 8 ЛЮТАГА, АЎТОРАК

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 16.55, 18.00, 19.00, 22.45** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10, 18.50, 00.30** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** «Арэна». Праграма аб спорце.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**11.00** Крымінальная меладрама «Зацьмненне» (Расія - Украіна).
**12.10** Кінаэпапея «Людзі на балоце» («Беларусьфільм»). 1-я серыя.
**13.35** Дакументальны фільм «Іван Мележ. Смуга над багнаю».
**14.05** Ход у адказ.
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Патрабуецца.
**15.50** Дэтэктыўны серыял «Жураў» (Расія).
**17.00** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**17.50** Крымінальная меладрама «Зацьмненне» (Расія - Украіна).
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Сфера інтэрасаў».
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Дэтэктыўны серыял «Абдуры мяне» (ЗША). Заключная серыя.
**22.55** Меладраме «Рыкі» (Францыя).
**00.35** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.10** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.10** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Тата на ўсе рукі». Камедыйны серыял.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Шчаслівыя разам». Серыял.
**18.55** «Хай кажуць».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Доктар Тырса». Шматсер. фільм.
**22.10** Прэм'ера. «Капітан Гардзееў». Шматсерыйны фільм.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Несакрэтныя матэрыялы».
**00.05** «Іван Падушкін. Джэнтльмен вышуку». Шматсерыйны фільм.
**00.55** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца.Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**08.30** СТБ прадстаўляе: «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.00** Фільм «Ягорына гора». Расія, 2008г.
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Дарослыя гульні». Серыял. Заключная серыя.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Халасцякі». Серыял.
**15.35** «Ваенная таямніца».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Агонь кахання». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**21.30** «Вялікі горад».
**22.05** «Аўтапанарама».
**22.55** «Мёртвы, жывы, небяспечны». Серыял.
**00.00** «Інструктар». Серыял. Закл. серыя.

---

**06.35** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.35** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.30** Серыял «Ты маё жыццё».
**10.35** «Дон Сезар дэ Базан». Музычная камедыя (СССР). 1-я серыя.
**11.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Агляд тура.
**12.50** Авертайм.
**13.15** «Запал па культуры».
**14.00** Прыгодніцкая меладрама «Зямля святла» (Францыя- Бельгія). 2-я серыя.
**14.55** Серыял «Сіла прыцягнення».
**15.50** Пазакласная гадзіна.
**16.05** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**16.55** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**18.00** Меладраматычны серыял «Ты маё жыццё» (Аргентына).
**19.05** «Дон Сезар дэ Базан». Музычная камедыя (СССР). 2-я серыя.
**20.25** «Калыханка».
**20.40** Тэлебарометр.
**20.45** Беларуская часіна.
**21.45** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**22.25** Моладзевы серыял «Універ» (Расія).
**22.55** «Спорт-кадр».
**23.25** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

---

РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Дэтэктар хлусні. Жэсты». Дак. фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Нічога асабістага». Інфармацыйна-сатырычная праграма.
**11.45** «Кулагін і партнёры».
**12.15** Тэлесерыял «Класныя мужыкі».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Рускі шакалад». Тэлесерыял.
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Цуд».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Тэлесерыял «Класныя мужыкі».
**22.20** Прэм'ера. Тэлесерыял «Аператыўнікі. Хронікі забойнага аддзела. Новая версія».
**23.20** Навіны - Беларусь.
**23.30** «Весткі.ru».
**23.45** «НЛА Трэцяга рэйха». Дак. фільм.

---

НТВ

**06.05, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**06.10** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.40** Серыял «Таксістка».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.25** «Кватэрнае пытанне».
**11.20** «Следства вялі…».
**12.10** «Да суду».
**13.30** Серыял «Ментоўскія войны».
**15.15** «Справа густу».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Серыял «Бывай, «Макараў»!».
**21.30** Прэм'ера. Баявік «Святаннік».
**23.40** Серыял «Чужы твар».

---

EUROSPORT

**09.30** Вось дык так!!!
**09.45** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**10.00, 14.00** Біятлон. Кубак свету ў ЗША (Прэск-Айл). Мужчыны. Гонка пераследу.
**10.30, 14.30** Біятлон. Кубак свету ў ЗША (Прэск-Айл). Жанчыны. Гонка пераследу.
**11.15** Горныя лыжы. Кубак свету ў Германіі (Цвізель). Жанчыны. Слалам. 2-я спроба.
**11.45, 00.30** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі. Жанчыны. Супергігант.
**13.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Расіі (Рыбінск). Жанчыны. 4х5 км.
**15.00** Тэніс. Турнір WTA у Францыі (Парыж). Дзень 2-і.
**20.45** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен).
**21.00** Бокс.
**22.00** Футбол. Кубак 4-х нацый у Вялікабрытаніі. Ірландыя - Уэльс.
**00.00** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit.
**01.30** Футбол. Эўра-2012. Таварыскі матч. Агляд.

---

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20, 19.35** Гарачы каментар.
**07.30, 12.05** Еўропа сёння.
**07.55** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**08.15, 12.50** Госць «Белсату».
**08.30** Невядомая Беларусь: «Еўрапейскі баль», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**09.05, 13.35** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «Валянцін Тарас», дак. фільм, Беларусь.
**09.25, 13.55** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Барбара Радзівіл і Жыгімонт Аўгуст».
**09.35, 14.05** «Скрадзеная малітва», дак. фільм, 2008 г., Польшча.
**09.55** «Мой родны горад», серыял.
**10.15** «Час гонару», серыял: 15 серыя.
**11.05, 15.35** «Гняздо», серыял: 3 серыя.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**12.30** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**13.05** Невядомая Беларусь: «Еўрапейскі баль», дак. фільм, 2010 г., Беларусь.
**14.20** «Мой родны горад», серыял.
**14.45** «Час гонару», серыял: 15 серыя.
**16.25** «Саматра», дак. фільм, 2007 г.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Мой родны горад», серыял.
**17.30** «Кансультацыя ў ружовым садзе», серыял: 23 серыя.
**18.30** «Бульбаны», мультсерыял.
**18.40** ПраСвет.
**19.05** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.15** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнавальная праграма): «Сымон Будны».
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.50** Праект «Будучыня».
**20.20** «Аляксандр Ісачоў. Майстар і Афрадыта», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**20.40** Беларусы ў Польшчы.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** Сальда (эканамічная праграма).
**21.40** Рэпартэр.
**22.05** «Доктар Марцін», серыял.
**22.50** Аб'ектыў.
**23.15** Гарачы каментар.

## 11 ЛЮТАГА, ПЯТНІЦА

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.35** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.10, 08.15** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**07.05, 08.10** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.10** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**10.05** Серыял «Маршрут літасці» (Расія).
**10.50** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**11.40** Дзённік конкурсу «Трыўмф. Героям спорту».
**12.10** Меладрама «Калі на поўдзень паляцяць жураўлі» (Украіна). 2-я серыя.
**14.05** «Школа доктара Камароўскага» .Токшоў (Украіна).
**14.30** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Патрабуецца.
**15.50** Дэтэктыўны серыял «Жураў» (Расія).
**16.50** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё».
**17.55** Крымінальная меладрама «Зацьменне» (Расія-Украіна).
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**19.55** Камедыйная меладрама «Маргоша».
**21.00** Панарама.
**21.45** Камедыя «Новы хлопец маёй мамы» (Германія-ЗША).
**23.45** Дак. цыкл «Неразгаданая гісторыя».
**00.40** Дак. цыкл «Зброя будучыні» (ЗША).
**01.30** Дзень спорту.

---

**06.00, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Жыць здарова!».
**10.10** «Мая жонка мяне прычаравала». Шматсерыйны фільм.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Смак».
**11.50** «Тата на ўсе рукі». Камедыйны серыял.
**12.20** «Дэтэктывы».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Кантрольны закуп».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.50** «Зразумець. Прабачыць».
**15.25** «Хачу ведаць».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Заручальны пярсцёнак». Шматсерыйны фільм.
**17.05** «Слова жанчыне». Шматсер. фільм.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Чакай мяне». Беларусь.
**18.55** «Поле цудаў».
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Здабытак Рэспублікі».
**23.05** Прэм'ера. Фільм «Дом сонца».
**00.55** «Наша Беларашa».
**01.30** Начныя навіны.

---

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «СТБ-спорт».
**07.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Апошні сакрэт Майстра». Серыял.
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Трымай мяне мацней». Тэленавэла.
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.40** «Званая вячэра».
**12.35** «Агонь кахання». Серыял.
**13.50** «Дурні, дарогі, грошы». Гумарыстычны серыял.
**14.40** «Халасцякі». Серыял.
**15.30** «Мёртвы, жывы, небяспечны». Серыял.
**16.50** «Ля парадната пад'езду».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** Ток-шоў «Лёс».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Мярзотнік». Францыя - Італія - Румынія , 1971г.
**22.55** «Гарачы лёд».
**23.25** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.10** Фільм «Нар'ега - любімчык бога». ЗША, 2000г.
**02.05** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

---

**07.00** ЛАДная раніца.
**08.00** Тэлебарометр.
**08.05** Камедыйны серыял «Інтэрны».
**08.35, 16.05** Дэтэктыўны серыял «Чыста англійскія забойствы» (Вялікабрытанія).
**09.30** Серыял «Ты маё жыццё».
**10.35** «Мой Захад». Камедыйны вестэрн.
**12.10** Жывы гук.
**12.55** Кінаспробы.
**13.15** Прыгодніцкая меладрама «Зямля святла» (Францыя- Бельгія). Закл. серыя.
**14.10** «Фатограф Ульяна». Дак. фільм.
**14.35** Мультсерыял «Сямейка піратаў».
**15.00** Пазакласная гадзіна.
**15.15** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».
**17.05** Усё аб бяспецы.
**17.35** Серыял «Ты маё жыццё».
**18.40** Біятлон. Кубак свету. Спрынт. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**20.00** «Проста Хлеб». Дак. фільм.
**20.30** «Калыханка».
**20.45** Тэлебарометр.
**20.50** «Рэпарцёр «Беларускай часіны».
**21.40** «Бітва экстрасэнсаў».
**22.40** «Пра мастацтва».
**23.05** Дыялогі аб рыбалцы.
**23.35** Дэтэктыўны серыял «Налётчыкі».

---

РОССИЯ

**07.00** «Раніца Расіі».
**09.20** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**10.10** «Мой срэбны шар».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Кулагін і партнёры».
**12.00** Тэлесерыял «Класныя мужыкі».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.30** «Аб самым галоўным». Ток-шоў.
**15.25** «Рускі шакалад». Тэлесерыял.
**16.15** Тэлесерыял «Дворык».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.20** «Кулагін і партнёры».
**17.50** Тэлесерыял «Цуд».
**18.50** «Ефрасіння». Тэлесерыял.
**19.50** Навіны - Беларусь.
**20.30** Фільм «Пачуй маё сэрца». 2010 г.
**22.15** Навіны - Беларусь.
**22.25** «Дзяўчаты».
**23.25** Юбілейны канцэрт Хору Турэцкага.

---

НТВ

**06.05, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**06.10** Інфармацыйны канал «НТБ раніцай».
**08.35** Серыял «Таксістка».
**09.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**10.20** «У зоне асаблівай рызыкі».
**10.50** «Жывуць жа людзі!».
**11.20** «Справа цёмная». Дэтэктыў.
**12.05** «Да суду».
**13.35** «Суд прысяжных: галоўная справа».
**15.05** «Прафесія-рэпарцёр».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** «Следства вялі…».
**20.30** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**20.55** Прэм'ера. «Ген усеўладдзя». Навукова дэтэктыў.
**22.20** «Нтвшнікі». Арэна вострых дыскусій.
**23.30** Прэм'ера. Крымінальны трылер «Вораг дзяржавы №1».

---

EUROSPORT

**09.30** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі. Жанчыны. Супергігант.
**10.45, 14.30** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Жанчыны. Хуткасны спуск і камбінацыя.
**12.15** Біятлон. Кубак свету ў ЗША (Форт-Кент). Жанчыны. Спрынт.
**13.30** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Мужчыны. Хуткасны спуск. Трэніроўка.
**15.00, 01.30** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі. Жанчыны. Слалам і камбінацыя.
**16.00** Тэніс. Турнір WTA у Францыі (Парыж). Чвэрцьфінал.
**17.45** Футбол. Эўра-2012. Таварыскі матч. Агляд.
**18.30, 23.30** Біятлон. Кубак свету ў ЗША (Форт-Кент). Мужчыны. Спрынт.
**19.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Кваліфікацыя. HS 207.
**20.15** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен).
**20.30** Лёгкая атлетыка. Міжнародны турнір у памяшканні (Дзюсельдорф, Германія).
**22.30, 23.00** Самыя моцныя людзі планеты. Турнір «Giants Live» (Вялікабрытанія).
**00.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Вікерсунд). Кваліфікацыя. HS 207.
**01.00** Экстрэмальны спорт. Freeride Spirit.

---

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20, 19.35** Гарачы каментар.
**07.30, 12.05** Праект «Будучыня».
**07.55, 12.30** Рэпартэр.
**08.20, 12.55** Без рэтушы: «Быць беларусам, быць аптымістам», рэпартаж, Польшча.
**08.45** Форум (ток-шоу): «Адзін за аднаго».
**09.30** Хто ёсць кім?: Станіслаў Шушкевіч: ч. 2.
**09.45** «Школа на санцапёку», серыял.
**10.10** Басанож па свеце: «Мужчынскі свет».
**10.35, 15.10** Блізкая гісторыя. Іншы погляд: «З выцягнутымі рукамі», дак. фільм, 2006 г., Польшча: ч. 2.
**11.30, 16.10** МакраФон: «Бардаўская восень–2007»: выступ Змітра Вайцюшкевіча з «W-Z аркестрам»: ч. 1.
**12.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**13.15** Форум (ток-шоу): «Адзін за аднаго».
**14.00** Хто ёсць кім?: Станіслаў Шушкевіч: ч. 2.
**14.20** «Школа на санцапёку», серыял.
**14.45** Басанож па свеце: «Мужчынскі свет».
**16.40** «Мой свет нарадзіўся ў кузні», дак. фільм, 2008 г., Беларусь.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Дзяўчына з мокрай галавою», серыял: 4 серыя: «Насуперак лёсу».
**17.30** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял.
**18.20** Форум (ток-шоу): « Адзін за аднаго».
**19.05** «Танцуючы з мядзведзем», рэпартаж, 2009 г., Польшча.
**19.30** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** На колах.
**20.25** «Святаслаў Фёдараў – жыццё пасля смерці», дак. фільм, 2006 г.: ч. 1: «Хуткі».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.25** Госць «Белсату».
**21.40** «Браты-ворагі», дак. серыял, Францыя: 8 серыя: «Паляўнічы ды эколаг».
**22.10** «Панна Ніхто», маст. фільм, Польшча.
**23.45** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Лёха з імглы».
**23.55** Аб'ектыў.
**00.20** Гарачы каментар.

## 12 ЛЮТАГА, СУБОТА

---

**06.45** Дзень спорту.
**06.55** Мультфільмы.
**07.30** Існасць.
**07.55** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** Здароўе.
**09.45** Кулінарнае шоў «Кухар дома» (ЗША).
**10.15** «Славянскі базар».
**10.45** Камедыйны серыял «Сваты-2» (Украіна). 1-я серыя.
**12.10** Дэтэктыўны серыял «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана» (СССР).
**13.50** Сінематэка.
**14.35** «Зона Х». Вынікі тыдня.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Вакол планеты.
**16.15** Nota Bene.
**16.45** Дакументальны цыкл «Атлас «Дыскаверы» (ЗША).
**17.40** Відэафільм АТН «Шчучынскі апокрыф» цыклу «Зямля беларуская».
**17.55** «Ваша лато».
**18.45** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.25** «КЕНО».
**19.30** «Новая хваля-2010».
**21.00** Панарама.
**21.40** Фільм тыдня. Камедыі «Знаёмства з бацькамі» (ЗША).
**23.40** Канцэрт лаўрэатаў прэміі «Залаты грамафон» (Расія).
**01.30** Дзень спорту.

---

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Серыял «Мая выдатная няня».
**09.45** «Здароўе».
**10.35** «Смак».
**11.15** Прэм'ера. «Смак жыцця».
**12.20** «Разумніцы і разумнікі».
**13.10** «Хвіліна славы».
**15.10** «Мой радавод».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Асяроддзе пасялення.
**17.15** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**18.15** Камедыя «Сем'янін».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Фільм «Дзяўчына з жамчужнай завушніцай».
**23.00** «Дэтэктар хлусні».
**00.00** «Пражэктарпэрысхілтан».
**00.40** Трылер «Барвовыя рэкі».

---

**06.25** «Румпельштыльцхен». Германія, 2007 г.
**07.50** Фільм «Мярзотнік». Францыя - Італія - Румынія , 1971 г.
**09.35** «Давай паспрабуем?».
**10.30** «Мінск і мінчане».
**11.05** СТБ прадстаўляе: «КультУРА!».
**11.40** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.25** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.00** Фільм «Валянцін і Валянціна». СССР, 1985 г.
**15.45** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Наша справа».
**17.00** «Вялікі горад».
**17.40** Фільм «А я кахаю жанатага». Расія - Украіна, 2008 г.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** «Зорны рынг».
**21.30** Фільм «Пастка». ЗША - Германія - Вялікабрытанія, 1999 г.
**23.35** Фільм «Правілы кахання». Італія, 2000 г.
**01.25** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

---

**07.45** Нашы тэсты.
**08.15** Усё аб бяспецы.
**08.45** «Рэальны свет».
**09.15** Дыялогі аб рыбалцы.
**09.45** Жансавет.
**10.20** Дача здароўя.
**11.05** Тэлебарометр.
**11.10** «Ты і Я». Забаўляльнае ток-шоў (Расія).
**12.10** «Запал па культуры».
**12.55** «Таямніца Мунакра». Прыгодніцкі фільм (Францыя-Вялікабрытанія-Венгрыя).
**14.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. Манчэстэр Юнайтэд-Манчэстэр Сіці. Прамая трансляцыя.
**16.40** Біятлон. Кубак свету. Гонка пераследу. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**17.35** «Смешныя людзі» Гумарыстычная праграма (Расія).
**19.00** Біятлон. Кубак свету. Гонка пераследу. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**19.45** Тэлебарометр.
**19.50** «Шальныя грошы». Авантурная камедыя (ЗША).
**21.45** «Цыкута, або Сусветная гісторыя атручванняў». Камедыя (Расія).
**23.40** Жывы гук.
**00.20** «Знайсці Аманду». Камедыя (ЗША).

---

РОССИЯ

**07.00** Мультфільмы.
**07.25** Фільм «Дробязі жыцця».
**08.40** Фільм «Пачуй маё сэрца». 2010 г.
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Суботнік».
**11.50** Фільм «Быць лішнім».
**13.40** «Пакой смеху».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Сумленны дэтэктыў».
**14.45** «Шукальнікі». Дак. фільм.
**15.40** «Апошняя гастроль Джо Дасэна». Дакументальны фільм.
**16.40** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**17.40** «Суботні вечар».
**19.00** «Карціна свету».
**19.55** Надвор'е на тыдзень.
**20.00** Весткі ў суботу.
**20.45** Тэлесерыял «Цыганачка з выхадам».
**00.00** Фільм «Добры дзень і бывай».

---

НТВ

**07.30** «Агляд».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Авіятары».
**08.50** «Выратавальнікі».
**09.20** «Жывуць жа людзі!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Жаночы погляд».
**14.05** Фантастычны камедыйны баявік «Дзеці шпіёнаў-2».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Апошняе слова». Вострасюжэтнае ток-шоў.
**17.25** «Вочная стаўка».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.00** «Праграма Максімум».
**21.10** «Руская сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**22.10** «Ты не паверыш!».
**23.15** «Музычны рынг НТБ».
**00.30** Трылер «Пакуль яе не было».

---

EUROSPORT

**09.30** Біятлон. Кубак свету ў ЗША (Форт-Кент). Мужчыны. Спрынт.
**10.30** Санкавы спорт. Кубак свету ў Расіі (Парамонава). Двойкі. 2-я спроба.
**11.15** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Вікерсунд). Кваліфікацыя. HS 207.
**11.45** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Мужчыны. Хуткасны спуск.
**13.30** Санкавы спорт. Кубак свету ў Расіі (Парамонава). Жанчыны. 2-я спроба.
**14.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Вікерсунд). Кваліфікацыя. HS 207.
**14.30** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Жанчыны. Хуткасны спуск.
**15.30** Біятлон. Кубак свету ў ЗША (Форт-Кент). Мужчыны. Спрынт.
**16.15** Біятлон. Кубак свету ў ЗША (Форт-Кент). Мужчыны. Гонка пераследу.
**17.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Вікерсунд). HS 207.
**18.45** Біятлон. Кубак свету ў ЗША (Форт-Кент). Жанчыны. Гонка пераследу.
**19.45** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен).
**20.00** Тэніс. Турнір WTA у Францыі (Парыж). Паўфінал.
**21.30** Канькабежны спорт. Чэмпіянат свету ў Канадзе (Калгары). Дзень 1-ы.
**02.00** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Мужчыны. Хуткасны спуск.

---

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.20** Гарачы каментар.
**07.30** На колах.
**08.00** «Трэці афіцэр», дэтэктыўны серыял.
**08.45** «Дзяўчына з мокрай галавою», серыял: 4 серыя: «Насуперак лёсу».
**09.15** Калыханка для самых маленькіх.
**09.40** «Святаслаў Фёдараў – жыццё пасля смерці», дак. фільм, 2006 г., Беларусь: ч. 1: «Хуткі».
**10.15** Маю права (прававая праграма).
**10.35** «Танцуючы з мядзведзем», рэпартаж, 2009 г., Польшча.
**10.55** Госць «Белсату».
**11.10** «Браты-ворагі», дак. серыял, 2001 г., Францыя: 8 серыя: «Паляўнічы ды эколаг».
**11.40** Асабісты капітал.
**11.55** Форум (ток-шоу): «Адзін за аднаго».
**12.40** На колах.
**13.10** «Дзяўчына з мокрай галавою», серыял: 4 серыя: «Насуперак лёсу».
**13.40** Калыханка для самых маленькіх.
**14.05** «Паэма веры» дак. фільм, 2007 г., Беларусь.
**14.30** «Панна Ніхто», маст. фільм, 1996 г., Польшча.
**16.10** «Ранча», серыял: 31 серыя.
**17.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**17.05** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**18.00** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Абарыгены», дак. фільм, 2009 г., Расія.
**18.40** «Ваенны фатограф», дак. фільм, 2001 г., Швейцарыя.
**19.35** Навігатар.
**19.50** Калыханка для самых маленькіх.
**20.00** Еўропа сёння.
**20.25** Вагон.
**20.30** «Верная», дак. фільм, 2008 г., Расія.
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.15** Суботні сеанс: «Адна рука не пляскае», маст. фільм, 2003 г., Чэхія.
**22.55** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Парада».
**23.05** Аб'ектыў.

## 13 ЛЮТАГА, НЯДЗЕЛЯ

**07.20** Дзень спорту.
**07.35** Мультфільмы.
**08.45** «Зброя». Цыкл дакументальны фільмаў (Беларусь).
**09.00, 12.00, 15.00, 19.00** Навіны.
**09.10** «Арсенал».
**09.40** Альманах вандраванняў.
**10.10** У свеце матораў.
**10.45** «Культурныя людзі».
**11.20** «Школа доктара Камароўскага». Токшоў (Украіна).
**12.10** Дэтэктыўны серыял «Прыгоды Шэрлака Холмса і доктара Ватсана» (СССР).
**13.45** Відэафільм АТН «Уладзімір Мулявін. Песня аб долі».
**14.35** Зямельнае пытанне.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** Відэафільм АТН «Белавежская паляванне».
**16.05** Меладрама «Каханне на сене» (Расія). 1-я і 2-я серыі.
**18.05** Суперлато.
**19.20** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна).
**20.30** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**20.50** «КЕНО».
**21.00** У цэнтры ўвагі.
**21.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**22.25** Прэм'ера. Рамантычная камедыя «Я ненавіджу Дзень Святога Валянціна» (ЗША).

**07.00** «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** Серыял «Мая выдатная няня».
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.15** «Фазэнда».
**12.00** «Ранішняя пошта».
**12.35** Тэлечасопіс «Звяз».
**13.05** «Бацькі нехаця».
**14.00** «КВЗ. 50 віртуальных гульняў».
**15.00** «Брэйн рынг».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** «Давай ажэнімся!»
**17.30** Прэм'ера АНТ. «Эстрадны кактэйль».
**18.45** Прэм'ера АНТ. «Зачыстка».
**20.00** Контуры.
**21.05** Ток-шоў «Кухня».
**21.40** «Якія нашы гады! 1962».
**23.10** Прэм'ера. Камедыя «V цэнтурыя. У пошуках зачараваных скарбаў».
**01.10** Фільм «Дэкамерон».

**06.00** Фільм «Прыгоды маленькага таты». СССР, 1979 г.
**07.05** Фільм «Пастка». ЗША - Германія - Вялікабрытанія, 1999 г.
**09.00** СТБ прадстаўляе: «Гаворыць і паказвае Мінск».
**09.30** «Аўтапанарама».
**10.00** «Відавочнік прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.35** «Салдаты. Залатыя серыі».
**13.20** «Добры дзень, доктар!».
**13.55** Фільм «Не самы ўдалы дзень». СССР, 1966 г.
**15.35** Ток-шоў «Лёс».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Праўда».
**17.30** Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.40** Фільм «Асабліва цяжкія злачынствы». ЗША, 2002 г.
**22.45** «Прафесійны бокс».
**23.45** Фільм «Два дні ў Парыжы». Германія - Францыя, 2007 г.
**01.30** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

**07.20** Дабравест.
**07.20** Дабравест.
**07.50** Мір вашай хаце.
**08.00** «Таямніца Мунакра» (Францыя-Вялікабрытанія-Венгрыя).
**09.50** Медычныя таямніцы.
**10.35** Школа рамонту.
**11.40** Тэлебарометр.
**11.45** Нашы тэсты.
**12.20** Кінаспробы.
**12.45** «Правы чалавека».
**13.00** Гаспадар.
**13.30** Бухта капітанаў.
**14.10** «Аўтастаянка». Камедыя (ЗША).
**16.00** Дакументальны цыкл «Неверагодныя гісторыі кахання» (Украіна).
**16.55** Біятлон. Кубак свету. Гонка з масавым стартам. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**17.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ерліга. Болтан - Эвертан. Прамая трансляцыя.
**19.55** Смешная часіна.
**20.30** «Навіны надвор'я».
**20.55** Біятлон. Кубак свету. Гонка з масавым стартам. Жанчыны.
**21.55** Меладрама «Маналетэ» (Вялікабрытанія-Іспанія).
**23.45** Культасвет.
**00.10** Канцэрт «George Michael. Life in London « (ЗША).

РОССИЯ

**07.00** Мультфільмы.
**07.50** Тэлесерыял «Цыганачка з выхадам».
**11.00** Весткі.
**11.15** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** Мультфільмы.
**12.35** Фільм «Імгненне поспеху».
**14.00** Весткі.
**14.15** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**14.45** «Рамантыка рамансa».
**15.35** «Раман з серыялам». Дакументальны фільм.
**16.35** Фільм «Вершнік без галавы».
**18.30** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**20.00** Весткі тыдня.
**21.05** Прэм'ера. «Танцы з Зоркамі». Сезон - 2011.
**23.55** «Адмысловы карэспандэнт».
**00.55** Фільм «Свая чужая сястра».

НТВ

**07.40** Мультфільм «Прыгоды пінгвіняткі Лола».
**08.00** Сёння.
**08.20** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Першая перадача». Аўтамабільная праграма.
**10.55** «Справа цёмная». Гістарычны дэтэктыў.
**11.50** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Таямнічая Расія».
**14.10** Фільм «Бамжыха».
**16.00** Сёння.
**16.20** «Развод па-руску».
**17.25** «І зноў добры дзень!».
**18.25** «Надзвычайнае здарэнне». Агляд за тыдзень.
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.55** «Цэнтральнае тэлебачанне».
**22.05** Прэм'ера. Фільм «Гаспадар».
**23.55** «Асабліва небяспечны!».
**00.35** «Нерэальная палітыка».

EUROSPORT

**09.30** Санкавы спорт. Кубак свету ў Расіі (Парамонава). Мужчыны. 1-я спроба.
**10.30** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Вікерсунд). HS 207.
**11.15** Санкавы спорт. Кубак свету ў Расіі (Парамонава). Мужчыны. 2-я спроба.
**12.00** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). Жанчыны. Хуткасны спуск.
**13.30** Біятлон. Кубак свету ў ЗША (Форт-Кент). Жанчыны. Гонка пераследу.
**14.00** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Вікерсунд). HS 207.
**14.45** Скачкі з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Вікерсунд). HS 207.
**16.30** Біятлон. Кубак свету ў ЗША (Форт-Кент). Жанчыны. Гонка пераследу.
**17.00** Біятлон. Кубак свету ў ЗША (Форт-Кент). Мужчыны. Мас-старт.
**17.45** Лёгкая атлетыка. Міжнародны турнір у памяшканні (Карлсруэ, Германія).
**19.15** Біятлон. Кубак свету ў ЗША (Форт-Кент). Жанчыны. Мас-старт.
**19.55** Снежны выходны. Агляд. Часопіс.
**20.00** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен).
**20.15** Тэніс. Турнір WTA у Францыі (Парыж). Фінал.
**21.30** Канькабежны спорт. Чэмпіянат свету ў Канадзе (Калгары). Дзень 2-і.

БЕЛСАТ tv BELSAT

**07.00** Аб'ектыў.
**07.10** Еўропа сёння.
**07.40** «Арол: крымінальная сага», серыял.
**08.35** «Зорны пірат», серыял: 1 серыя.
**09.00** Калыханка для самых маленькіх.
**09.30** Форум (ток-шоў): «Адзін за аднаго».
**10.15** Навігатар.
**10.30** «Верная», дак. фільм, 2008 г., Расія.
**11.00** Вагон.
**11.05** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**11.10** Незвычайнае жыццё звычайных людзей: «Абарыгены», дак. фільм, 2009 г., Расія.
**11.40** «Ваенны фатограф», дак. фільм, 2001 г., Швейцарыя.
**12.35** Еўропа сёння.
**13.05** «Зорны пірат», серыял: 1 серыя.
**13.30** Калыханка для самых маленькіх.
**13.55** МакраФон: «Бардаўская восень–2007»: выступ Лявона Вольскага: ч. 2.
**14.25** «Адна рука не пляскае», маст. фільм, 2003 г., Чэхія.
**16.05** «Ранча», серыял: 32 серыя.
**17.00** Прэс-экспрэс (агляд медыяў).
**17.15** «Час гонару», серыял: 16 серыя.
**18.05** Рэмарка (культурніцкая праграма).
**18.25** Дакументальная гадзіна: «89 міліметраў», дак. фільм, 2004 г., Германія–Беларусь.
**19.45** Моўнік (лінгвістычная праграма).
**19.45** Калыханка для самых маленькіх.
**19.55** Гісторыя пад знакам Пагоні (спазнаваўчая праграма): «Васіль Цяпінскі».
**20.05** ПраСве.
**20.30** Басаножаж па свеце: «Розум».
**21.00** Тыдзень у «Аб'ектыве».
**21.30** Эксперт.
**21.55** Фільматэка майстроў: «На злом галавы», маст. фільм, 2004 г., Германія–Турцыя.
**23.55** «Калыханка» ад Сашы і Сірожы (сатырычная праграма): «Сабакі-мутанты».
**00.05** Тыдзень у «Аб'ектыве».

## Шаноўныя чытачы!

**На жаль, газету «Новы час» немагчыма набыць у шапіках або крамах. Няма нас і ў дзяржаўнай сістэме распаўсюду Белпошты. Але можна падпісацца на «Новы час» і кожны тыдзень атрымліваць газету.**

Падпісацца можна на любую колькасць месяцаў, аформіўшы банкаўскі ці паштовы перавод і накіраваўшы копію плацёжнага дакументу на адрас рэдакцыі. (Глядзіце ўзоры квітанцый). Нашы рэквізіты: **рахунак 3012741108019 у аддзяленні №539 ААО «Белінвестбанка», код банка 153100739. Адрас банка: 220004, Мінск, вул. Калектарная, 11. Адрас рэдакцыі: 220113, Мінск, вул. Мележа, 1, офіс 1234.**

Акрамя таго падпісацца можна ў нашых рэгіянальных прадстаўнікоў:

Магілёў: (8 029) 604 34 57, Юрый;
Віцебск: (8 029) 3084978, Юрый;
Масты: (8 029) 1264692, Язэп;
Мінск: (8 029) 968 79 73, Аляксей;
(8 029) 178 31 68, Вольга.

БЕЛПОЧТА

ф. ПС 112

**ЭЛЕКТРОННЫЙ ДЕНЕЖНЫЙ ПЕРЕВОД**

№ ______ (вход, по карте отправки)

ВЫРУЧКА ☐ НАЛОЖЕННЫЙ ПЛАТЕЖ ☐

(сумма цифрами) (сумма прописью)

ПОЛУЧАТЕЛЬ___ Г-та «Новы час», р/с 3012741108019 отд. №539 ОАО «Белинвестбанк», код 153100739, УНН 190790926

КУДА 220004, г. Минск, ул. Коллекторная, 11
почтовый код, адрес получателя, телефон)

ОТПРАВИТЕЛЬ ______
почтовый код, адрес отправителя, телефон)

АДРЕС ______

Доставка ☐ уведомление ☐ простое ☐ заказное ☐ электронное

(назначение платежа)

(письменное сообщение)

Отметки отделения почтовой связи места приема:
(почтовый код, оттиск контрольно-переводной печати, кол. шт.)
№ перевода по ф. 5 ____________
Время приема _______ ч. _____ мин.
Подпись

### Шаноўныя чытачы!

З 1 студзеня 2011 года падпісны кошт аднаго нумара газеты 750 руб. аднаго месяца — 3000 руб.

«Новы час» запрашае да супрацоўніцтва распаўсюджвальнікаў газеты ва ўсіх рэгіёнах Беларусі.

**Даведка па тэл: (8 029) 651 21 12.**

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
отд. №539 ОАО «Белинвестбанк»
(наименование банка)

| Счет получателя | 3012741108019 | Лицевой счет | Код 739 |
|---|---|---|---|
| УНП* | 190790926 | | |

(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|
| | | | | |

Период подписки указывает абонент

Плательщик

Пеня ______
Всего ______

Кассир

**Для тых, хто прымае рашэнні!**

Новы час

**www.novychas.org**

**ПАДРАБЯЗНАСЦІ**

# ХТО АДБІЎ ГАЛАВУ СТАЛІНУ?

Алег **НОВІКАЎ**

**Разбурэнне помніка Сталіну ў Запарожжы стала падставай для буйной зачысткі ўкраінскага нацыяналістычнага поля.**

У навагоднюю ноч у Запарожжы прагучаў выбух. Каля офісу Кампартыі ўзляцела ў паветра дзіўная манументальная кампазіцыя — бюст без галавы (галаву помніку адбілі за некалькі дзён да гэтага).




Усяго бюст Сталіна прастаяў у горадзе 7 месяцаў. І ўвесь гэты час помнік быў аб'ектам грамадскай палемікі. Правыя і аранжавыя неадназова патрабавалі знесці манумент, які камуністы ўстанавілі без санкцыі мэрыі. Бацькі гораду прызнавалі, што бюст усталяваны без іхняга дазволу і юрыдычна Сталіна трэба дэмантаваць, аднак да канкрэтыкі ў іх рукі не даходзілі. Акрамя таго, камуністы цяпер — урадавая партыя, і сварыцца з імі ніхто асабліва не хацеў. У выніку тое, што не зрабілі ўлады, зрабілі радыкалы, разбурыўшыя бюст у навагоднюю ноч.

Адзінай ахвярай тэракту аказалася шкло ў вокнах партыйнага офісу. Аднак міліцыя паставілася да гэтага вельмі сур'ёзна. Была распачата крымінальная справа па артыкулу «тэрарыстычны акт». Наступнымі днямі па гораду пракаціліся масавыя арышты. За кратамі аказаліся ўсе больш-менш заўважныя мясцовыя нацыяналісты, і ў тым ліку ўсе лідары арганізацыі «Трызуб імя Сцяпана Бандэры».

Назва гэтай структуры мала што казала большасці ўкраінцаў. «Трызуб» быў заснаваны ў сярэдзіне 1990-х гадоў як ваенна-спартыўнае крыло Кангрэсу ўкраінскіх нацыяналістаў. Кангрэсам кіравала легендарная ўкраінская нацыяналістка Яраслава Стэцько, якая вярнулася ў краіну з эміграцыі. Дзейнасць «Трызуба» заключалася ў абароне мітынгаў і атаках на акцыі камуністаў. З часам Стэцько, партыя якой захапіла адміністрацыі шэрагу гарадоў Заходняй Украіны, і «Трызуб» разышліся ў поглядах. У 1999-м «Трызуб» адправіўся ў вольнае плаванне.

Наступны этап гісторыі арганізацыі вельмі не звычайны. Акрамя традыцыйных праваакцый супраць «чырвоных», сябры «Трызуба» завярцелі дзіўны флірт з Кучмам. Спачатку яны падтрымалі ягоную кандыдатуру на выбарах. Пасля, у час акцыі «Украіна без Кучмы», займаліся тым, што лавілі і збівалі вядучых працІўнікаў тагачаснага прэзідэнта. У 2004 годзе «Трызуб» стаў складовай часткай «Руху за нацыю» (дзіўны праект нацыяналістаў, прыхільнікаў абрання на пасаду прэзідэнта Януковіча).

Нягледзячы на такія манеўры, пасля аранжавай рэвалюцыі «Трызуб» стаў у абарону новай дэмакратычнай улады. Хаця некаторыя языкі кажуць, што гэта была чарговая правакацыя. У 2006 годзе падчас аранжавай кампаніі за адстаўку ўраду Януковіча «Трызуб» заклікаў натоўп не абмяжоўвацца стаяннем на Майдане, а ісці на «апошні і рашучы» штурм будынку Кабміну.

Пасля апісаных падзей «Трызуб» амаль знік з палітычнай сцэны, каб гучна заявіць пра сябе выбухам у Запарожжы на Новы год. Вяртанне ў вялікую палітыку адбылося вельмі эфектна.

У прынцыпе, з прыходам Януковіча рэпрэсіі супраць радыкалаў-нацыяналістаў набылі сталую форму. Практычна раз на тыдзень кагосьці трасуць або заводзяць справу. Аднак такога, каб арыштаваць усіх лідараў арганізацыі па спісу, яшчэ не было. У дадатак, як сцвярджаюць праваабаронча арганізацыі, сяброў «Трызуба» ў турме каталі. Прычым не проста збівалі, а ўжывалі больш вытанчаныя метады.

Усё гэта дало глебу для дыскусіі наконт таго, што ж сапраўды адбываецца ў краіне. Версію пра тое, што «Трызуб» насамрэч збіраўся стаць украінскімі «Чырвонымі брыгадамі», большасць аналітыкаў адкідваюць. Як іранічна напісала адна з запарожскіх газет, каментуючы заяву МУС пра знойдзены ў трызубаўцаў склад зброі, «лепш бы ў іх знайшлі самагонны апарат — гэтаму яшчэ можна паверыць».

Некаторыя кажуць, што мае месца прашчупванне нацыяналістычнага флангу. Зрабіўшы ператрус у трызубаўцаў, спецслужбы атрымалі шмат інфармацыі пра так званыя «вышкалы» — трэніровачныя лагеры нацыяналістаў. Гэтай інфармацыі цалкам хапае, каб завесці справу па артыкулу «Сяброўства ў арганізаванай злачыннай групоўцы» і шантажаваць нізавы актыў арганізацыі, прымусіць кагосьці «стукаць». Таксама міліцыя можа «наехаць» на былых сяброў «Трызуба», якія перахварэлі на радыкалізм і цяпер займаюць уплывовыя пасады. Сярод іх, напрыклад, Сяргей Квіт, рэктар Кіева-Магілянскай акадэміі (інтэлектуальны бастыён праціўнікаў рэжыму Януковіча). Якраз зараз Квіт пасварыўся з Мінадукацыі, якое пагражае забраць у акадэміі ліцэнзію.

Аднак большасць палітолагаў бачыць ва ўсім гэтым фрагменты буйнейшай палітычнай гульні. «Трызуб» — адна з нешматлікіх нацыяналістычных арганізацый, якая мае маральнае права крытыкаваць Алега Цягнібока, лідара вядучай правай арганізацыі «Свабода», які, па чутках, фінансуецца Януковічам для расколу аранжавага лагеру. Здаецца, аранжавыя вырашылі біць ворага ягонай зброяй. У час мясцовых выбараў мінулага года «Трызуб» пасля доўгага перапынку нечакана выпусціў газету «Бандэрівець». Яна была цалкам прысвечаная Цягнібоку, які выстаўляўся ў самым негатыўным ракурсе. Вядома, што сродкі на тыраж «Трызуб» атрымаў ад БЮТ. Ёсць інфармацыя, нібыта Цімашэнка разглядала «Трызуб» у якасці выканаўца сілавых акцый супраць «Свабоды».

Між тым, у Партыі рэгіёнаў вялікія планы наконт «Свабоды». Усе кажуць пра план «Цягнібок — новы Сіманенка», які быццам распрацаваны паліттэхнолагамі бела-сініх. Сэнс схемы ў тым, каб у фінальную пульку будучых прэзідэнцкіх выбараў вывесці Януковіча і Цягнібока. Вынік гэтай дуэлі відавочны. Менавіта па падобнай схеме выйграў выбары 1999 года Леанід Кучма, які праўдамі і няпраўдамі раскруціў камуніста Сіманенку да ўзроўню свайго галоўнага канкурэнта. Электарат, пастаўлены перад выбарам — або Кучма, або камуніст — абраў меншае зло.

Запусціўшы кампанію супраць «Трызуба», улада вырашае для сябе два пытанні: ліквідуе канкурэнта Цягнібока і радыкалізуе памяркоўных нацыяналістаў і нацдэмаў, пераводзячы іх у маргінальнае поле.

Ёсць яшчэ адзін важны момант у гэтай загадкавай гісторыі. Апошнім часам Украіну накрыла хваля тэрарызму. На працягу некалькіх месяцаў выбухі адбыліся ў трох гарадах. У Макееўцы справа дайшла нават да масавай панікі сярод насельніцтва. Крайнімі ў выніку аказаліся МУС і яго цяперашні кіраўнік Анатоль Магілёў, які праславіўся разгонамі акцый крымскіх татар і апазіцыі. Зруйнаванне бюсту Сталіна аказалася вельмі дарэчы. Хуткія арышты падазраваных у арганізацыі тэракту хоць неяк ратуюць рэнамэ ведамства ў вачах грамадства.



## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

У нас шмат кажуць пра каштоўнасці. Але ўвесь час грэбуюць імі. І не толькі на дзяржаўным узроўні, але і на асабістым. Многім, напрыклад, добра вядома пра даўнія сяброўскія адносіны кіраўніка ўкраінскага знешнепалітычнага ведамства Канстанціна Грышчанкі і экс-намесніка міністра замежных спраў Беларусі Андрэя Саннікава (пра гэта пісалі айчынныя СМІ). Мы не ведаем, як ставіўся Канстанцін Іванавіч да палітычнай дзейнасці сябра і яго выбарчай кампаніі ў прэзідэнты РБ. Але, напэўна, гэта не галоўнае ў сяброўстве. Галоўнае — упэўненасць, што ў цяжкую хвіліну сябар заўсёды прыйдзе на дапамогу.

**«Дзеркало Тижня»** (Украіна)

Для прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі тыя санкцыі, якія прыняў Еўрапейскі Саюз, былі чаканымі. Лукашэнка сам давёў справу да ўвядзення такіх санкцый, заняўшы вядомую ўсім пазіцыю пасля выбараў прэзідэнта краіны, калі разагнаў дэманстрацыю апазіцыі, збіў апазіцыянераў. Еўрапейскі Саюз павінен быў адрэагаваць. Тактыку морквы, якую ўжывалі дагэтуль, працягваць стала немагчыма. З боку Лукашэнкі, магчыма, будуць розныя крокі: дэманстратыўныя, касметычныя змены і вельмі павярхоўныя ліберальныя жэсты.

**«demosEUROPA»** (Польшча)

Зараз Еўрапейскі Саюз тым больш павінен узгадніць з Расіяй сумесную палітыку ў адносінах да Беларусі. Менавіта падтрымка Масквы напачатку снежня 2010 года дазволіла Лукашэнку задушыць беларускую апазіцыю на прэзідэнцкіх выбарах. У выніку Лукашэнка апынуўся цалкам ва ўладзе Масквы. Тое, што Крэмль, а асабліва расійскі прэзідэнт Мядзведзеў, ужо даўно незадаволены Лукашэнкам, зразумела з мінулага лета, калі ў расійскіх СМІ пачалася кампанія супраць беларускага прэзідэнта. Разлік Масквы зразумець лёгка: Крэмль аддае перавагу ненавіснаму, але затое залежнаму Лукашэнку, які не можа павярнуцца ў бок Еўропы. Калі Еўрасаюз жадае штосьці змяніць у Мінску, то павінен вынесці беларускую тэму на павестку дня перамоў з Расіяй і пераканаць Маскву ў тым, што постаць Лукашэнкі не адпавядае інтарэсам расійска-еўрапейскага партнёрства.

**«Deutche Welle»** (Германія)

Пытанне кошту БелАЭС звязанае з немалаважным пытаннем «адкатаў». Эканамічных чыннікаў для Расіі падтрымліваць беларускую АЭС, якая стане прамым канкурэнтам Балтыйскай АЭС, што будуецца ў Калінінградскай вобласці, няма. Застаецца меркаваць, што будаўніцтва ладзіцца не з мэтай атрымліваць прыбытак, прадаючы электраэнергію ў рэгіёне, які і так ёй забяспечаны, а для чагосьці іншага. Напрыклад, для «перанакіравання фінансавых плыняў» падчас будаўніцтва.

**«Bellona»** (Расія)

Візавыя санкцыі — гэта тое, што беларускае кіраўніцтва ўжо праходзіла і, як заяўляў на мінулым тыдні сам Лукашэнка, да гэтага прызвычаілася. Да таго ж нельга сказаць, што візіты ў Еўропу беларускіх чыноўнікаў такія ўжо частыя. Хутчэй, у пакаранні візамі пераважае маральны аспект. У той жа час для ўлады, якая здольная ў дзень выбараў збіць і пасадзіць у турму больш за 700 чалавек, маральны аспект мае мінімальнае значэнне.

**«Независимая газета»** (Расія)

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ




### ТУНІС. ДАЛОЎ ПРЭЗІДЭНЦКУЮ РЭСПУБЛІКУ

Туніс вырашае, як жыць далей пасля падзення дыктатуры. Важнай часткай грамадскай дыскусіі сталі дэбаты вакол будучай мадэлі дзяржаўнага ладу. Большасць тунісцаў выступае за змены ў канстытуцыі і пераход да парламенцкай мадэлі кіравання. Прычына не толькі ў тым, што прэзідэнцкая рэспубліка дыскрэдытавала сябе за часы Бен Алі. Шмат хто баіцца, што на выбарах прэзідэнта пераможа функцыянер старога рэжыму. Ідэю змены канстытуцыі падтрымлівае апазіцыя, якая пакуль слаба арганізаваная. У любым выпадку, дыскусія цікавая, паколькі ў арабскім свеце, акрамя Лівана і Ірака, усе дзяржавы маюць прэзідэнцкую форму кіравання. Прэзідэнт — гэта амаль манарх. Ён кантралюе паліцыю і армію, можа распускаць парламент і здымаць кіраўніка ўраду. На думку шмат каго, альтэрнатывай можа быць іракская канстытуцыя. Амерыканскія юрысты, якія яе напісалі, большую частку ўлады перадалі парламенту. Іракскі прэзідэнт папросту прадстаўляе дзяржаву. Парадокс сітуацыі ў тым, што правядзення выбараў прэзідэнта, прычым як мага хутчэй, патрабуе Еўропа — галоўны партнёр Тунісу. На думку экспертаў, у Брусэлі дасюль баяцца, што вакуум улады прывядзе да дэстабілізацыі краю і росту ўплыву ісламістаў.

**Па матэрыялах «Jungle World» (Германія)**

### РАСІЯ. АНЕКДОТЫ ПРА ЛУКАШЭНКУ – ЗБРОЯ КПРФ

КПРФ прыдумала новы сродак піяру. На партыйных сайтах мясцовых арганізацый створаны спецыяльны аддзел палітычных анекдотаў. Героямі анекдотаў становяцца прэзідэнт, міністры або сябры «Адзінай Расіі». Пры гэтым зюганаўцы не вельмі заклапочаныя тым, якія анекдоты з'яўляюцца на сайтах. Інакш на тыя анекдоты не звярнула бы ўвагу ФСБ. На думку чэкістаў, некаторыя анекдоты ўтрымліваюць прамыя заклікі да дзяржаўнага перавароту. Каб разруліць сітуацыю, Зюганаву давялося асабіста ісці да Пуціна з падборкай крамольных анекдотаў. Па словах лідара КПРФ, анекдоты Пуціну спадабаліся. Ён ацаніў наступны: «Мадэрнізацыя — гэта практычна новая расійская рэлігія. Яна, як Бог, — ніхто не бачыў, але ўсё кажуць, што ёсць». Пуцін у выніку запатрабаваў, каб пераслед камуністаў за анекдоты прыпынілі. Як адзначае *«Независимая газета»* вялікі блок анекдотаў на сайтах КПРФ прысвечаны асобе Аляксандра Лукашэнкі, які выглядае вельмі прэзентабельна на фоне расійскага калегі і яго прэм'ера. Ці дапамогуць камуністам анекдоты пра Рыгоравіча, мы даведаемся вельмі хутка. 13 сакавіка ў Расіі — адзіны дзень галасавання, калі будуць абірацца мясцовыя саветы шэрагу рэгіёнаў.

**Па матэрыялах «Независимой газеты» (Расія)**

### БАЛІВІЯ. ЛІСЦЕ КОКІ ЎСЁ ЯШЧЭ ПАД ЗАБАРОНАЙ



Ідэя балівійскага прэзідэнта Эва Маралеса легалізаваць лісце кокі, з якога вырабляюць какаін, правалілася. Як ужо пісаў «Новы Час», не так даўно афіцыйны Ла-Пас пачаў сусветную кампанію за перагляд рэзалюцыі ААН ад 1976 года, якая патрабуе ад сяброў арганізацыі знішчэння плантацый кокі. Гэтае рашэнне было прынятае ў рамках барацьбы з наркамафіяй. Аднак, на думку Маралеса, лісце кокі не мае нічога агульнага з наркотыкамі. Гэта частка індзейскай культуры і эфектыўны лек. Каб легалізаваць коку, Балівія паслала ў розныя краіны сваіх дыпламатаў. Часам яны дабіваліся свайго: Перу, Аргенціна і Эквадор падтрымалі прапанову Балівіі ў ААН. Аднак у ініцыятывы Маралеса знайшліся моцныя праціўнікі: ЗША, Вялікабрытанія і Швецыя. Яны разам у ААН завярнулі праект. Балівія адрэагавала на навіну арыгінальна. У краіне заснаваны Дзень барацьбы за легалізацыю кокі — Acullico. Адзначаць новы дзень будуць маніфестацыямі каля амбасадаў краін, якія выступілі супраць легалізацыі кокі. Натуральна, пры гэтым маніфестантам рэкамендавана жаваць лісце кокі.

**Па матэрыялах «America 21» (Мексіка)**

ЦІКАВА



# ЯН ПАВЕЛ II СТАНЕ СВЯТЫМ

**Алег НОВІКАЎ**

**Папа Бенедыкт XVI вызначыў дату беатыфікацыі свайго папярэдніка Яна Паўла II. Каб прызнаць яго святым, спатрэбілася спецыяльнае даследаванне наконт таго, ці зрабіў Караль Вайтыла які-небудзь цуд.**

Беатыфікацыя (працэс надання чалавеку сану святога) амаль закончаная. Папе засталося паставіць подпіс і вызначыць дату мерапрыемства. Магчыма, з-за таго, што былы пантыфік актыўна дапамагаў польскаму прафсаюзу «Салідарнасць», урачысты акт адбудзецца 1 мая, у Міжнародны дзень салідарнасці ўсіх працоўных. Непасрэдна набажэнства адбудзецца ў рымскай капэле Божай міласці.

Увогуле, ніводны Папа ў гісторыі не даваў згоды на беатыфікацыю свайго папярэдніка. Піянерам стаў Бенедыкт XVI. 13 мая 2005 года наконт гэтага было прынята спецыяльнае рашэнне. З іншага боку, і асаблівай крытыкі такое рашэнне не выклікала. Больш таго, яшчэ падчас пахавання Яна Паўла II натоўп скандаваў: «Santo subito!» («Святы зараз!»). Аднак пры гэтым Бенедыкт XVI вырашыў не парушаць кананічны закон, які дазваляе пачынаць працэс прылічэння да святых толькі праз 5 гадоў пасля смерці кандыдата.

Пытаннямі ўслаўлення ў каталіцкай царкве займаецца Кангрэгацыя па справах святых у Ватыкане, якая вывучае прадстаўленыя матэрыялы і накіроўвае іх на зацверджэнне Папы. Інакш яе называюць «фабрыка святых».

Для кананізацыі неабходна чатыры задакументаваных цуды, якія адбыліся па малітве вернікаў памерламу праведніку, для беатыфікацыі — два. Пры беатыфікацыі пакутнікаў факту цуду не патрабуецца.

Увогуле, апошнім часам Касцёл вельмі асцярожны ў справах прызнання цудаў. У мінулым было зарэгістравана шмат цудаў, якія зараз выклікаюць вялікі недавер. Так, у 1640 годзе былі зарэгістраваны наступны цуд: адзін малады іспанец, якому ампутавалі нogі, праз пару год нечакана зноў атрымаў нагу і змог хадзіць.

Што да Папы Яна Паўла II, то яму прыпісвалі таксама шмат цудаў. Напрыклад, адзін з канадскіх веласіпедыстаў, на шлеме якога была выява Папы, у выніку аварыі не атрымаў траўму мозга. Нейкая дзяўчына пабачыла профіль Папы падчас малітвы ў дзень другой гадавіны ягонай смерці і г.д.

Аднак выбар кангрэгацыі чамусьці выпаў на выпадак з французскай манашкай Марыяй-Сімон Норман. У 2001 годзе дактары паставілі ёй дыягназ — хвароба Паркінсона. Праз чатыры гады ў манашкі пачаўся крызіс. Медыкі заключылі, што Марыю не выратаваць. Тады ўсе манашкі грамады, да якой належала Марыя, пачалі маліцца Яну Паўлу II, і здарыўся цуд — хворая хутка стала на ногі і нават пачала працаваць.

Працэдура высвятлення таго, ці здарыўся з Марыяй цуд, была няпростай. Адзін з нейрахірургаў, якіх запрасілі ў якасці сведак, сказаў, што не ўпэўнены наконт таго, што спадарыня Норман сапраўды хварэла на Паркінсона. Нейкі час ксяндзы нават думалі пашукаць у біяграфіі Караля Вайтылы які-небудзь іншы цуд.

Атэістычная прэса сцвярджае, што ў гэты момант у справу ўмяшаліся людзі з атачэння папярэдніка Папы. Быццам яны даказалі, што хоць нейкі цень, кінуты на Папу, можа зашкодзіць іміджу Ватыкана.

Так ці інакш, пасля гэтага справа сапраўды пайшла як па маслу. Быў заменены сакратар кангрэгацыі. Гэту пасаду заняў Марчэла Барталучы. І нарэшце Ян Павел устанавіў рэкорд па хуткасці працэсу прылічэння да святых (папярэдні належаў Маці Тэрэзе).

Цяпер застаецца толькі ўрачыста абвясціць былога Папу святым. Першапачаткова рытуал беатыфікацыі быў запланаваны на вясну мінулага года. Аднак пасля было вырашана перагледзець каляндарны план. Чаму — ніхто не ведае. Атэісты, натуральна, сцвярджаюць, што прычынай быў скандал са святарамі-педафіламі. Увогуле, трэба чакаць, што да дня беатыфікацыі яны выльюць на Вайтылу чарговую порцыю кампрамату. Зараз на іх сайтах ахвотна спекулююць наконт таго, што будучы святы рэгулярна бічаваў сябе за грахі. Гэта прызналі некалькі блізкіх да яго людзей.

Так ці інакш, 1 мая 2011 года гісторыя чалавека Караля Вайтылы закончыцца. Пачнецца гісторыя святога Яна Паўла.

Між тым, Рым гудзіць. Не паспеў Ватыкан агучыць дату, як Вечны горад пагрузіўся ў працэс падрыхтоўкі да свята. Чакаецца, што на беатыфікацыю прыбудуць 2 мільёна пілігрымаў. Кошты на гатэлі ў Рыме на красавік—май выраслі на 300–400 працэнтаў. Сувенірная вытворчасць працуе на поўную моц. Мясцовых рэсурсаў не хапае. Дадатковы наклад абразкоў з выявай Вайтылы замовілі аж у Кітаі. Падрыхтоўка да свята ўжо выклікала спрэчкі сярод біскупаў. Напрыклад, адна з фракцый Касцёлу выступае за тое, каб абразкі з выявай Папы вернікі маглі атрымліваць бясплатна. Але большасць святароў з гэтым пакуль не згодная.

НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ

# СУДАНСКІ РЭФЕРЭНДУМ

Алег НОВІКАЎ

**Сепаратысты ўсяго свету каментуюць вынікі рэферэндуму ў Паўднёвым Судане, які дае права яго жыхарам на стварэнне сваёй дзяржавы.**




На палітычнай мапе свету будуць змены. Картографам давядзецца дамаляваць новую дзяржаву. Яе канчатковая афіцыйная назва яшчэ дыскутуецца, але тое, што яна вось-вось з'явіцца, не выклікае спрэчак. Па выніках рэферэндуму, які цягнуўся амаль месяц, жыхары Паўднёвага Судану атрымалі права на дзяржаўнае будаўніцтва. За такую перспектыву прагаласавала амаль 99 працэнтаў тых, хто ўзяў удзел у рэферэндуме.

Свет вітае вынікі плебісцыту, і на гэта ёсць некалькі падстаў. Па-першае, закончыўся вайсковы канфлікт, які цягнуўся амаль 50 гадоў. Нагадаем, што ў аснове супрацьстаяння — этна-рэлігійны кантраст паміж Поўначчу, дзе жывуць арабы-мусульмане, і Поўднем, арэалам пражывання афрыканскіх плямёнаў, якія спавядаюць мясцовыя культы або хрысціянства.

Па-другое, Хартум прадэманстраваў сапраўды нешта вельмі незвычайнае для афрыканскіх шыротаў: суданскі прэзідэнт не толькі даў паўднёвым жыхарам дазвол на апытанне. Больш таго, гарант асабіста наведаў Поўдзень у дзень пачатку рэферэндуму. Такі ўзровень плюралізму не характэрны нават для еўрапейцаў: каментуючы падзеі ў Судане, генсек ААН не хаваў, што хацеў бы, каб і іншыя палітыкі дэманстравалі такую талерантнасць.

Ці будуць палітычныя лідары больш талерантнымі пасля падзей у Судане, гэта пакуль пытанне. А вось сепаратыстам усяго свету прыклад Судану вельмі імпануе. Практычна ўсе непрызнаныя дзяржавы або сепаратысцкія рухі на планеце жыва пракаментавалі ход галасавання і ягоныя вынікі.

Так, Міністэрства замежных спраў непрызнанай Абхазіі прысвяціла Судану спецыяльную заяву.

Яе аўтары «з задавальненнем адзначаюць з'яўленне новай прызнанай дзяржавы, створанай праз наўпростае волевыяўленне грамадзян. «Сёння можна канстатаваць, што Рэспубліка Судан, якая атрымала незалежнасць у сярэдзіне XX стагоддзя, не адбылася як адзіная дзяржава. Чыннікі гэтага — ігнараванне волі значнай часткі насельніцтва краіны, нядольнасць цэнтральных уладаў да кампрамісу і жаданне сілай навязаць людзям іншую культуру, чужы лад жыцця і мыслення. Гісторыя Паўднёвага Судану, як і шматлікіх іншых канфліктных кропак планеты, паказвае, наколькі далёка ад дасканаласці сучасная светабудова», — гаворыцца ў заяве.

У такім жа духу вытрыманая заява Міністэрства замежных спраў непрызнанай Прыднястроўскай Малдоўскай Рэспублікі (ПМР). Цірасполь заклікае Кішынёў звярнуць увагу на працэсы ў Афрыцы: «Новай уладзе, якая фармуецца ў Малдове, неабходна звярнуць увагу на сучасныя тэндэнцыі ў свеце, якія так ярка выяўляюцца сёння на прыкладзе Паўднёвага Судану. У новага кіраўніцтва Малдовы ёсць шанец зрабіць гістарычны крок да канчатковага і справядлівага ўрэгулявання малдоўска-прыднястроўскіх адносін. Сусветны досвед пацвярджае, што такое рашэнне канфлікту становіцца найбольш цывілізаваным спосабам урэгулявання адносін».

Такім чынам, непрызнаныя дзяржавы пабачылі ў суданскім рэферэндуме доказ таго, што іх амбіцыі на суверэнітэт цалкам законныя, а мэты — дасягальныя. Логіка простая: суданскіх паўстанцаў таксама доўгі час ніхто не прызнаваў, аднак у выніку ўсё стала на свае месцы.

У сваю чаргу, выданні метраполій, якія не хочуць даваць волю рэгіёнам, апублікавалі шэраг матэрыялаў, якія даказваюць, што Паўднёвы Судан дабіўся незалежнасці дзякуючы спецыфічным фактарам. Паўднёвым суданцам усміхнулася геапалітычная фартуна.

Таму, што адбываецца, Паўднёвы Судан абавязаны пазіцыі ЗША і Еўропы, якія ў тым ліку зацікаўленыя ў карысных выкапнях рэгіёна.

Сепаратысты прызнаюць гэты момант, аднак акрамя абурэння нічога выказаць не могуць. «Рассячэння Судану жадае Захад, які адмаўляе Прыднястроўю ў праве на значна больш цывілізаванае, дэмакратычнае, празрыстае і нетэрарыстычнае жыццё, якое край дэманструе ўжо цяпер і якое наўрад ці ў агляднай будучыні прадэманструе Судан», — піша газета «Приднестровье».

Што тычыцца сепаратысцкіх рухаў, то для іх суданскі прэцэдэнт стаў устаноўкай на актывізацыю дзейнасці.

«Новы Час» ужо пісаў пра незвычайны заклік, які актывісты руху карпацкіх русін зрабілі на адрас Кіева. Яны патрабавалі ад украінскага ўраду тэрмінова правесці рэферэндум, падобны на суданскі, у Закарпацці. У іншым выпадку Януковічу пагражаюць партызанскай барацьбой.

Рух карпацкіх русінаў — гэта хутчэй кур'ёз. Чаго, на жаль, нельга сказаць пра сепаратысцкія рухі ў Афрыцы.

Калі верыць сайту ФБР, то сёння сепаратысцкія рухі дзейнічаюць у 23 афрыканскіх краінах. А ў некаторых — Нігерыя, Дэмакратычная Рэспубліка Конга, Ангола — іх нават некалькі. Калі б яны ўсе перамаглі, на мапе з'явіліся такія экзатычныя дзяржавы, як Кабіла (тэрыторыя цяперашняга Алжыру), Рэспубліка Кабінда (тэрыторыя Анголы), Біяфра (Нігерыя), Дэмакратычная Рэспубліка Бакасі, і нават Фараонаўская рэспубліка коптаў (Егіпет).

Часам гэтыя групоўкі дзейнічаюць не палітычнымі, а вайсковымі сродкамі. Напрыклад, Рэвалюцыйная Армія Сахары, якая выступае за дзяржаўнасць туарэгаў.

Рэферэндум у Судане стане для іх знакам для пачатку пераходу ў наступ па ўсіх франтах. Аднак у заходніх выданнях папулярная адваротная думка. Так, «Christian Science Monitor» лічыць, што заканчэнне вайны ў Судане — гэта хутчэй прыкмета неактуальнасці сепаратызму для эліт этнічных меншасцяў.

«Самыя бедныя краіны становяцца багацей. Калі ў большасці краін рост ВУП не перавышае 3 працэнты, то ў Афрыцы на Поўдзень ад Сахары ён складае штогод 5,5 працэнта. У некаторых краінах ён увогуле фантастычны, напрыклад, у Гане — 11,3 працэнта. Не факт, што ўзбагачэнне прывядзе да эфектыўнай адміністрацыі, аднак тэму сепаратызму ён робіць неактуальнай. Эканамічны рост таксама развівае інфраструктуру, што робіць утапічнымі традыцыйныя стратэгіі сепаратыстаў — захапіць сталіцу правінцыі і супрацьстаяць цэнтру».

Адным словам, паводле «Christian Science Monitor» атрымліваецца, што стварэнне новай дзяржавы — гэта хутчэй заняпад сепаратызму. Прынамсі ў Афрыцы.

Што тычыцца Еўропы, то тут сітуацыя больш складаная. Як адзначае «Padonia» (орган аўтанамістаў Паўночнай Італіі), «згадайце, колькі дзяржаў падпісвала дакумент аб стварэнні АБСЕ і колькі дзяржаў сёння ўваходзяць у АБСЕ. На прыкладзе АБСЕ мы пераканаліся, што прынцып тэрытарыяльнай цэласнасці безумоўна накіраваны на забеспячэнне дзяржаўных інтарэсаў, але святой каровай ён больш ні для каго не з'яўляецца».

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### ГУРБАНГУЛЫ БЕРДЫМУХАМЕДАЎ

Прэзідэнт Туркменістана прыняў новы тытул — «Аркадаг», што ў перакладзе з туркменскай мовы азначае «Заступнік». Упершыню «Аркадагам» Гурбангулы назвалі 26 кастрычніка 2010 года на парадзе ў гонар угодак незалежнасці Туркменістана. Вялікі атрад туркменскіх вайскоўцаў, маршыруючы побач з Гурбангулы Бердымухамедавым, спыніўся і павярнуўся тварам да гаранта. Пасля ўсе вайскоўцы самаахвярна ўсталі перад ім на калені. Да трыбуны падвялі кахецінскага скакуна і некалькі разоў спрабавалі прымусіць яго таксама ўстаць перад прэзідэнтам на калені, але жывёла не паслухалася. Гэты канфуз кампенсавалі 600 дзяўчын, якія сваімі целамі склалі надпіс «АРКАДАГ» з наступным выкананнем песні «Алкыш сану, Аркадаг!» («Дзякуем табе, заступнік!»). Што прымусіла Гурбангулы прыняць новы тытул, незразумела. Нагадаем: папярэдні прэзідэнт Туркменістана Сапармурат Ніязаў меў іншы тытул — «Туркменбашы», гэта значыць «бацька ўсіх туркменаў». У любым выпадку, грамадскасць быццам не супраць новага тытула прэзідэнта. Ды і як яна можа быць супраць? Паводле туркменскага закона «Пра дзяржаўную здраду», здрадай радзіме лічыцца нават сумнеў у правільнасці курсу кіраўніка дзяржавы. Тым, хто такі сумнеў выкажа, пагражае 25 гадоў пазбаўлення волі.

### ЯРАСЛАЎ КАЧЫНЬСКІ



Лідара польскай партыі «Права і Справядлівасць» (PiS) падазраюць у плагіяце. Ён быццам бы карыстаецца напрацоўкамі вялікага фантаста Рэя Брэдберы. Менавіта так сцвярджае «Gazeta Wyborcza». Яраслаў быццам скраў у пісьменніка сюжэт яго апавядання «І ўдарыў гром». Адпаведна яму, адзін чалавек парушыў закон гісторыі, калі апынуўся ў мінулым і выпадкова забіў матыля. У выніку будучае цалкам змянілася. У варыянце Качыньскага гэты сюжэт прагучаў наступным чынам: напярэдадні трагедыі ў Смаленску да Камароўскага (цяперашні прэзідэнт, а тады спікер сейму) прыйшлі тры дэпутаткі, якія таксама збіраліся ехаць у Катынь. Яны папрасілі Браніслава змяніць графік сесіі, каб з-за страху перад палётамі паехаць туды цягніком. Спікер адмовіў. У выніку будучае змянілася: дэпутаткі былі вымушаны ляцець у Смаленск і разбіліся разам з іншымі палітыкамі. А маглі, калі верыць Качыньскаму, паехаць цягніком і застацца жыць. Такі незвычайны падыход выклікаў рэакцыю апанентаў. Яны ў сваю чаргу абвінавацілі PiS у тым, што партыя ў час знаходжання пры ўладзе не набыла новы прэзідэнцкі самалёт. Інакш бы ўсе засталіся жывымі, уключаючы трох згаданых дэпутатак. Палеміка ў стылі «а калі б» працягваецца, хаця некаторыя заклікаюць Качыньскага не даводзіць сямейную трагедыю да жанру навуковай фантастыкі.

### ТАН ШВЕ



Кіраўнік хунты, якая кіруе М'янамай з 1987 года, вырашыў, што прыйшоў час дэмакратычнай трансфармацыі. У М'янме ўпершыню за больш чым 20 гадоў пачаў працаваць парламент, які павінен абраць прэзідэнта і ўрад. Фактычна гэта значыць канец васковаму становішчу. Аднак новая сістэма нагадвае дэмакратыю хутчэй па форме. Дэпутацкі корпус складаецца, як правіла, з прадстаўнікоў вайсковай адміністрацыі. Аднак і тут хунта перастрахавалася. Парламенцкі статус забараняе акцыі пратэсту ўнутры будынка парламента. Парушэнне пункту цягне за сабою 2 гады турмы. Таксама парламентарыям забаронена карыстацца мабільнымі тэлефонамі і камп'ютарамі. Назіральнікі лічаць што «дэмакратызацыі» М'янмы — гэта, з аднаго боку, капітуляцыя генералаў перад санкцыямі міжнароднай супольнасці. З іншага — сродак легалізаваць свае капіталы. Зараз у М'янме назіраецца ліхаманкавы распродаж дзяржаўнай уласнасці фірмам, зарэгістраваным на гэтых жа генералаў. Калі ўсё прададуць, можна разлічваць на тое, што Тан Шве пусціць апазіцыю ў парламент і пачне шукаць дыялогу з ЕС і ЗША.

АКЦЫЯ

# ЁСЦЬ ШТО ЧЫТАЦЬ

## БЕЛАРУСКІЯ ПІСЬМЕННІКІ НАРЭШЦЕ ПАЧАЛІ ПРАДУКАВАЦЬ «ЛІТАРАТУРУ ДЛЯ ЎСІХ»

*Алесь ГІНЗБУРГ*

**28 студзеня адбылася беспрэцэдэнтная ў гісторыі айчыннага кнігадруку акцыя: пісьменнік з помпай адзначаў першы дзень продажу свайго твору. У выдавецтве «Логвінаў» выйшаў «Шалом» — доўгачаканы раман мастака і, ад нядаўняга часу, пісьменніка Артура Клінава. Апроч таго, прадстаўнікі выдавецтва «Логвінаў» намякнулі наконт далейшых планы кнігадруку. Рыхтуецца да выхаду яшчэ адзін узор займальнага чытва — раман «Тэорыя змовы» Уладзіслава Ахроменкі, літаратара, які, выяўляецца, умее пісаць і адзін — без Максіма Клімковіча. Здаецца, самы час абвесціць: доўгачаканая экспансія беларускамоўнай масавай літаратуры на кніжны рынак пачалася.**



Самы надзейны спосаб прыдбаць «Шалом» і — у перспектыве — «Тэорыю змовы» — зайсці ў кнігарню «Логвінаў», якая месціцца па мінскім адрасе праспект Незалежнасці, 37 А. Нямінскім чытачам можна параіць звярнуцца ў інтэрнэт-крамы knihi.by і prastora.by.

### «Шалом»: хочаш міру — рыхтуйся да вайны




У рамане «Шалом» беларускі мастак-авангардыст з Магілёва па імені Андрэ, як ён сам пра сябе кажа, «радавы арміі мастацтва», натхніўшыся пленэрам у Заходняй Германіі і не ў апошнюю чаргу пад уплывам вінных пароў, купляе на ўсе свае грошы кайзераўскую каску часоў першай сусветнай і вырашае ніколі яе не здымаць. Раскошны шалом зяе на яго галаве ў той час, калі ён вандруе ад Бона да Магілёва праз Гановер, Берлін, Варшаву, Брэст і Мінск, збіраючы па дарозе водгукі простых немцаў, палякаў, беларусаў наконт такой незвычайнай з'явы.

Чытач рамана атрымлівае выдатную магчымасць пераканацца, з якімі эстэтычнымі, ідэалагічнымі і проста цяжкасцямі сутыкаецца творца ў сучасным нятворчым свеце. Бо шаломам напяты на галаву мастака Андрэ не толькі «ад балды», а ў межах яго персанальнага арт-праекту, «мірнай вайны», абвешчанай усяму свету. Слова «шалом» — неаднаразова падкрэсліваецца ў кнізе, — можа быць перакладзенае як «мір». На гэтым каламбуры Артур Клінаў і будуе ўражвальны павільён свайго твору.

Раман «Шалом» — выдатны экспанат для венецыянскага Біеналe, калі б на гэтую шаноўную выставу прымалі і літаратуру таксама. Гэта дактыласкапічны адбітак сучаснага беларускага мастацкага андэграўнду. Шэраг айчынных дзеячаў культуры пазнАюць (і ўжо пазнаЮць) сябе ў персанажах рамана, выпісаных аўтарам з добрай іроніяй і бязмежнай сімпатыяй. Тым жа, хто далёкі ад колаў творчай багемы, выпадае шанец ненадоўга трапіць у іх хімерычны свет нефармальных арт-галерэяў, выдадзеных дзяржавай майстэрняў, вулічных перформансаў, сяброўскіх упісак, вакзальных гастраномаў і выцвярэзнікаў. Што-што, а быт мастака XXI стагоддзя ў рамане рэканструяваны напросту ідэальна.

Аўтарскае азначэнне жанру — «ваенны раман». Але ў кнізе пераплялося безліч іншых атракцыйных жанраў. Найперш, гэта раман-падарожжа — Артур Клінаў падае ўласнае бачанне кожнага гораду, у якім спыняецца яго альтэр-эга Андрэ, адводзячы найбольш увагі свайму ўлюбёнаму Гораду Сонца (ён жа Мінск, горад першай кнігі таго ж аўтара). Кожны горад асацыюецца ў героя з пэўным алкагольным напоем, што надае ўсяму палатну постмадэрністычнае падабенства з раманам «Масква-Петушкі» Венедыкта Ерафеева (у ролі Пятушкоў — дарагі кожнаму беларусу Магілёў, у ролі Масквы — груба кажучы, Заходняя Еўропа). Гэта, само сабой, і авантурны раман. І, нарэшце, гэта раман-палеміка з Фёдарам Дастаеўскім, якая будзе зразумелай любому, хто азнаёмлены з творчасцю расійскага класіка хаця б на ўзроўні школьнай праграмы.

Напрыканцы кнігі аўтар выруліў сюжэт на такі сабе раман-батлейку, але своечасова апамятаўся, і дзеянне заканчваецца на, скажам так, рэалістычнай ноце...

Не меншае (а на дадзеным этапе) і большае за змест кнігі значэнне мае разгорнутая вакол яе рэкламная кампанія. Здаецца, гэта першы выпадак у гісторыі айчыннага кнігадруку, калі адмыслова пад выхад кнігі запушчаны сайт, на якім да таго ж саму кнігу называюць не інакш, як «першым беларускім бестселерам». Сам Клінаў лічыць такі рэкламны вэрхал мастацкай акцыяй і, здаецца, не памыляецца. Калі ў першы дзень продажу тавару разыходзіцца на суму, меншую за патрачаную аўтарам на набыццё каньяку, які ён з радасцю распівае з пакупнікамі, то пра якую камерцыю тут можа ісці гаворка? З іншага боку — і гэта яшчэ не было прэзентацыі! Так што, як паглядзець, як паглядзець...

Фактам застаецца тое, што Клінаў — адзін з першых нашых пісьменнікаў, які свядома і цвёрда пастанавіў даць свайму чытачу лёгкі чытэльны прадукт, і пастаўленую задачу з поспехам выконвае.

### «Тэорыя змовы»: бітва дабра з казлом

Іншы пісьменнік, які сёлета запускае масавы праект, — Уладзіслаў Ахроменка. Яго «Тэорыя змовы» напісаная ў найлепшых традыцыях рамана «Янкі, або Апошні наезд на Літве», створанага ім не так даўно ў суаўтарстве з Максімам Клімковічам. «Янкі...», — расказаў нам аўтар, — паводле нашай задумы, былі амерыканскім гангстэрскім баевіком. «Тэорыя змовы» — таксама кінараман, але гэта ўжо еўрапейскае кіно». З ласкі пісьменніка, культглядальнік НЧ атрымаў магчымасць азнаёміцца з рукапісам рамана да афіцыйнага рэлізу.




«Кінараман-фарс» — так азначае свой твор Ахроменка — гэта гісторыя, якая адбываецца ў беларускім гарадку Таргачове ў наш час і ў залатыя часы Вялікага Княства Літоўскага. Сюжэт пабудаваны вакол барацьбы за Дзіду Лангіна — міфічную суперзброю чалавецтва, якой рымскі салдат аблегчыў пакуты Ісуса. У гэтай барацьбе змяшаліся высакародныя адраджэнцы пятнаццатага і дваццаць першага стагоддзя, ліцвіны, беларусы, рускія і «тожа рускія», а таксама адвечныя сілы Дабра і Зла. Сілы зла прадстаўленыя, адпаведна, Казлом — лідарам «рагатага быдла», якое запаланіла наш край і якому варта і жыццёва неабходна супрацьстаяць. Дабро ўвасабляюць немаўля-анёлак і загадкавы мача з абрэзам, які ахвочым шукаць літаратурныя паралелі нагадае Чорнага Вершніка з «Каласоў пад сярпом тваім» Уладзіміра Караткевіча. Персанаж, які аднachасова і коннік «Пагоні», і Інфернальны Каўбой, і Апошні Партызан — даўні архетып беларускай рамантычнай думкі, які вось-вось прыедзе, усё вырашыць і ўсіх ворагаў беларушчыны пакарае. Менавіта яго прысутнасць закручвае ўвесь твор на манер істэрну (так называюць вестэрны, дзеянне якіх адбываецца на ўсход ад Тэхасу).

«Тэорыя змовы» — сатырычны раман. Тут трапна і месцамі злосна выпісаныя ўсе тыпажы беларускай правінцыйнай рэчаіснасці: начальнікі-прыстасаванцы, ветэраны-сталіністы, ведзьмакі-камерсанты, дзяўчаткі-німфеткі і патрыёты-падпольшчыкі. Пільная ўвага надаецца насельнікам расійскай вайсковай базы «Волга-Волга», тон апісання якіх у творы, па чутках, зрабіў яго публікацыю ў рускім перакладзе неажыццяўляльнай. Усе вобразы выкананыя ў тэхніцы карыкатуры, а стыль рамана проста вымагае яго раскадроўкі на коміксы.

У галоўным героі — «высакародным адраджэнцы, паэце і маладым спецыялісце» Скіргайлу пазнае сябе ці не палова айчынных апазіцыйных палітыкаў і грамадскіх актывістаў. Палова гэтай паловы на аўтара смяротна пакрыўдзіцца — так з крышталёвых ідэалаў Зянона Пазняка ў Беларусі не кпілі з часоў «Зянонхопу». Іншая палова з удзячнасцю знойдзе ў прачытаным сваю порцыю пазітыву.

Бо «Тэорыя змовы» — гэта таксама класічны раман-выхаванне. Тры раздзелы твору маюць характэрныя загалоўкі «Фетышыст», «Змагар» і «Герой». З інфантыльнага аматара абвешваць сваё жытло бел-чырвона-белымі сцяжкамі ды значкамі «Пагоня» і крычаць лозунгі на плошчы, паэт Скіргайла пакрысе ператвараецца ў дарослага чалавека, які разумее, у чым сапраўдная геройства...

Выхад рамана «Тэорыя змовы» запланаваны на канец лютага.

### Дзесяць адрозненняў

«Шалом» Артура Клінава і «Тэорыя змовы» Ахроменкі гуляюць у адной вагавай катэгорыі, але, здаецца, аўтары — не канкурэнты. Па-першае, таму, што кнігі выдадзеныя звычайнымі для РБ мізэрнымі накладамі, якія не перавышаюць 1000 асобнікаў, і пра нейкі заўважны прыбытак казаць не выпадае. Па-другое, таму, што па-за рабленнем літаратурнай кар'еры абодва аўтара ставяць перад сабой кожны сваю звышзадачу, што ў звычайных умовах для масліту ўвогуле не характэрна.

На мой погляд, пры розніцы ў стылях і асабістым досведзе пісьменнікаў, у іх раманах шмат падобнага. Так адбылося, мабыць, таму, што аўтары апісваюць розныя бакі адной рэчаіснасці. Мастак-канцэптуаліст, які трапіў на заходні мастацкі пленэр, і паэт-адраджэнец, які загрымеў па размеркаванні ў райцэнтр, — прыватныя выпадкі агульнай з'явы, а менавіта — маргіналізацыі нашых творчых элітаў, абсалютна непатрэбных дзяржаве і сумнявадомай з нядаўняга часу «большасці». Для прадстаўнікоў гэтых элітаў, а таксама для тых, хто ім спачувае, і працуюць пісьменнікі.

Раманы поўныя рэфлексіяў над лёсам мастацтва (Клінаў) і беларускай незалежніцкай ідэі (Ахроменка). Героям не задавальняе тое, што яны бачаць навокал, і яны даюць гэтаму рады кожны, як умее: мастак Андрэ ўздзявае на галаву кайзераўскі шалом, а паэт Свідрыгайла прадае д'яблу душу за Бацькаўшчыну. Што характэрна, у фінале абодвух раманаў нам раскрываюцца рай і пекла. Чытач аўтаматычна ператвараецца ў гледача, месца якога — перад музейнай батлейкай. Так-так, нас, здаецца, зусім за дзяцей лічаць...

З іншага боку, магчыма, здзейснілася мара дзяўчынкі, якая нядаўна задалася ў Сеціве рытарычным пытаннем: да якога часу пабеларуску будуць друкаваць «адно інтэлектуалаў»? Дзе «нармальныя аўтары»? «Нармальныя аўтары», як бачыце, на падыходзе.

ШМАТПАКУТНЫЯ КРЫЖЫ

# ВІЦЕБСКІЯ КУРАПАТЫ

Таццяна УЛАСЕНКА

**Недалёка ад Віцебска, паміж вёскамі Паляі і Вароны, размяшчаецца ўрочышча пакут. Мясцовыя жыхары сцвярджаюць, што на гэтым месцы ў 1930–1940-х гадах органы НКУС па начах масава расстрэльвалі мірных людзей. Беларуская грамадскасць намагаецца стварыць тут крыжовую алею ў памяць ахвяраў сталінскіх рэпрэсій — так, як гэта зроблена ў Курапатах. Але пакуль адбываюцца іншыя падзеі — па звыкламу для сучаснай краіны сцэнару.**

Калі збіраўся матэрыял для гэтага артыкула, стала вядома, што 25 верасня гэтага года старшыня абласной суполкі Партыі БНФ Кастусь Смолікаў, які актыўна прымае ўдзел у мемарыялізацыі ўрочышча, атрымаў ад Воранаўскага сельскага выканаўчага камітэта загад дэмантаваць *«самовольно установленные»* крыжы. Я звязалася з Кастусём і пацікавілася сучасным станам мемарыяльных знакаў.

«Па загаду мясцовых уладаў, — распавёў Смолікаў, — мы павінны


ВАРОНАЎСКІ СЕЛЬСКІ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ
ВОРОНОВСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

15.09.2010 №02-31/152
На № ______ от ________

О нарушении порядка создания произведений монументального и монументально-декоративного искусства

Смоликову К.Э.
ул.Ильинского, д.37, кв.17
г.Витебск
Витебская обл.
Республика Беларусь

Вороновский сельский исполнительный комитет сообщает Вам, что постановлением суда Витебского района Витебской области от 5 января 2009 года Ваши действия в отношении установки деревянных крестов на территории Вороновского сельсовета в лесном массиве между населенными пунктами Поляи и Вороны признаны самовольными.

В соответствии с п.36 Постановления Совета Министров Республики Беларусь «Аб некаторых пытаннях стварэння (рэканструкцыі) і прыемкі твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва» от 19 сентября 2008 года № 1372 «За парушэнне дадзенага Палажэння, устаноўку твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва без належнага ўзгаднення вінаватыя несуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам. Творы манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва, якія ўстаноўлены самавольна або не прайшлі дзяржаўную прыёмку ва ўстаноўленым парадку, падлягаюць дэмантажу».

Предлагаю Вам до 1 октября 2010 года демонтировать установленные деревянные кресты.

В противном случае Вороновский сельский исполнительный комитет будет вынужден повторно обратиться в соответствующие инстанции по вопросу нарушения Вами Постановления Совета Министров Республики Беларусь «Аб некаторых пытаннях стварэння (рэканструкцыі) і прыемкі твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва» от 19 сентября 2008 года № 1372, а работы по демонтажу указанных крестов будут организованы без Вашего участия.

Председатель Ю.В.Осипов

20 36 22

былі дэмантаваць крыжы да 1 кастрычніка 2010 года, у адваротным выпадку працы па дэмантажу арганізавалі б дзяржаўныя органы. Такі сэнс дакумента. Але я наўмысна раблю аб'езд гэтых мясцінаў, правяраю — пакуль крыжы застаюцца некранутымі. Зараз я рыхтую адмысловую паперу ў Міністэрства культуры з просьбай надаць гэтым мясцінам статус гісторыка-культурнай каштоўнасці і зрабіць там мемарыял».

Упершыню ідэя пошуку слядоў масавых забойстваў у Палях належала Якаву Рыжыку. У 1980-х гадах ён апантана збіраў інфармацыю, запісваў сведчанні мясцовых жыхароў на плёнку. Да гэтага часу засталіся магнітафонныя запісы з аповедамі сведак крывавых расправаў. З яго ініцыятывы 5 лістапада 1989 года каля вёскі Паляі з'явіўся першы крыж у памяць ахвяраў сталінскіх рэпрэсій. Яму актыўна дапамагаў сябра Віцебскай суполкі БНФ Сяргей Цярэнцеў, які сваімі рукамі вырабіў крыж. За гэту справу яго ледзь не звольнілі з працы. Падчас усталявання і асвячэння драўлянага крыжа прысутнічалі сябры Віцебскай рады БНФ, грамадскія дзеячы, жыхары Паляёў, родныя і блізкія якіх сталі ахвярамі сталінізму. З цягам часу крыж струхнеў, і на яго месцы быў усталяваны вялікі шасціметровы металічны крыж ад праваслаўнай царквы (РПЦ).

30 кастрычніка 2007 года ля вёскі Паляі быў усталяваны яшчэ адзін крыж, зроблены Аляксандрам Салаўёнам. Тады ўсе ўдзельнікі акцыі ў колькасці 25 чалавек былі затрыманыя ля мемарыяльнага знака і дастаўленыя ў Віцебскі РАУС. Дзяржаўная скарбонка значна папоўнілася за кошт прысуджаных актывістам штрафаў. Дваццаццю базавымі велічынямі (на той момант даволі вялікія грошы — 620 тысяч рублёў) былі пакараныя сябры сойму КХП-БНФ Ян Таўпыга, Сяргей Каваленка, Сяргей Белязека, Барыс Хамайда; студэнт вышэйшай навуковай установы Зміцер Якаўлеў атрымаў штраф у адну базавую велічыню — 31 тысячу рублёў. На гэтым справа не завяршылася. Крыху пазней загадкава знік і сам крыж.

Напрыканцы кастрычніка 2009 года легендарны Мірон аднавіў крыж з надпісам «Змагарам за волю і незалежнасць ВКЛ — Беларусі». Пратрымаўся мемарыяльны знак усяго некалькі дзён.

Пагрозы з боку ўладаў, арышты, штрафы, рэпрэсіі не спынялі намаганні грамадскіх актывістаў мемарыялізаваць урочышча. І супрацьстаянне беларусаў з дзяржаўным вандалізмам на месцы «Віцебскіх Курапатаў» працягнулася. Хроніка ўсталявання, зносу памятных знакаў і ўціск на грамадскіх актывістаў уражвае. Так, 25 верасня 2009 года стала вядома, што былі знішчаны яшчэ некалькі крыжоў, пастаўленых цягам апошніх гадоў. З гэтай нагоды быў накіраваны адмысловы зварот у міліцыю Віцебскага раёна з патрабаваннем правесці расследаванне, знайсці вандалаў. Шукаць вандалаў не сталі, а ў правядзенні следства актывістам было адмоўлена на падставе малой сумы знішчанай маёмасці, якая, па падліках так званых «экспертаў», склала 132 тысячы 450 рублёў за крыж.

29 кастрычніка 2009 года на месцы былых крыжоў па ініцыятыве Кастуся Смолікава былі ўсталяваныя яшчэ 5 мемарыяльных знакаў, адмыслова пафарбаваных у чырвоны колер, стаўшы сімвалам сталінскай крывавай эпохі. «Самаўпраўства» каштавала актывісту дзвюх базавых велічыняў (70 тысяч рублёў) — такі штраф налічыла пракуратура Віцебскага раёна. 2 лістапада 2009 года з ініцыятывы Барыса Хамайды, Алены Сцяпанавай і Віктара Кабіка да чырвоных крыжоў дадаўся яшчэ адзін драўляны крыж.

Якраз зараз Воранаўскім сельскім выканкамам і вырашаецца лёс гэтых шматпакутных крыжоў, якія ў любым выпадку будуць аднаўлены беларускай грамадскасцю. Так сімвалічна адбываецца супрацьстаянне дабра і зла, памяці і небыцця, прадстаўнікоў беларускай нацыі і іх катаў.



КНІЖНЫ СВЕТ

# СТАЦЬ ЗМІЦЕРАМ ВАЙЦЮШКЕВІЧАМ

Анатоль МЯЛЬГУЙ

**У той час, калі лідары беларускай рок-музыкі ўзялі незапланаваны творчы адпачынак, вымушаную паўзу вырашылі запоўніць журналісты і музычныя крытыкі.**

Адзін за адным у свет пачалі выходзіць аўтарызованыя біяграфіі музыкантаў («Іх МРОЯ, іх N.R.M.» В. Дзятлікоўіча), энцыклапедыі і даведнікі па беларускай папулярнай музыцы («222 альбомы беларускага року і не толькі...», В. Мартыненкі і А. Мяльгуя, «Шоў-бізнэс у Беларусі» А. Перагудавай), грунтоўныя музычныя даследаванні («Гісторыя беларускай музычнай культуры ад старажытнасці да канца XVIII ст.» і «Музычная культура рыцарскага саслоўя Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага» З. Сасноўскага).

Некаторыя музыканты нават самі звярнуліся да жанру музычных мемуараў, як гэта зрабіў лідар этна-трыа «Троіца» Іван Кірчук, які выдаў свой падарожны дыярыюш «Аўтабаны і менестрэлі». Не так даўно з'явіўся працяг беларускай музычнай бібліятэкі — выданне, якому, на маю думку, наканавана стаць пачынальнікам цэлага напрамку ў айчыннай музычнай публіцыстыцы. Маю на ўвазе кнігу «Беларускае слова ад спеву», якая прысвечана творчай біяграфіі Зміцера Вайцюшкевіча і яго гурта «WZ-Orkiestra». Дарэчы, назву ёй даў паэтычны радок верша Р. Барадуліна «Беларускае слова», з якім чытач пазнаёміцца з самай першай старонкі кнігі.

Новае музычнае выданне пабачыла свет у выдавецтве «Кнігазбор» з ініцыятывы беларускай журналісткі, грамадскай дзячкі і знаўцы творчасці З. Вайцюшкевіча Элы Олінай (Дзвінскай). Менавіта яе энтузіязму і прафесійнаму падыходу да тэмы мы абавязаны тым, што чытачы могуць пазнаёміцца з гэтым арыгінальным біяграфічным выданнем. Эла з'яўляецца асноўным аўтарам матэрыялаў, прысвечаных спеваку, якія змешчаны ў кнізе. На яе плечы лягло і вырашэнне ўсіх арганізацыйных і каардынацыйных пытанняў, якія ўзнікаюць, калі рэалізуецца такі праект.

Тое, з якой мэтанакіраванасцю Э. Оліна распрацоўвала абраную музычную тэму творчасці З. Вайцюшкевіча, сведчыць, што ідэя кнігі з'явілася даўно. Бо ў аднначассе немагчыма запланаваць і апублікаваць біяграфічныя матэрыялы, якія адлюстроўваюць дзіцячыя і юнацкія гады спевака, яго вучобу, расповеды родных, зацемкі пра малую радзіму Зміцера — Бярозаўку, Лідчыну і Бацюхну-Нёмана... Як немагчыма сабраць і пагутарыць на тэму беларускай сучаснай музыкі і ролі ў ёй Зміцера Вайцюшкевіча




аднначасова з Рыгорам Барадуліным, Уладзімірам Някляевым, Генадзем Бураўкіным, Аляксандрам Мілінкевічам, Алесем Пушкіным, Віталем Супрановічам, Лявонам Вольскім, Алесем Камоцкім, Алегам Хаменкам і іншымі знакамітымі творцамі Беларусі. І вось цяпер мы можам пазнаёміцца з гутаркамі са знакамітымі паэтамі і пісьменнікамі, музыкамі і мастакамі, даведацца нямала цікавых фактаў біяграфіі З. Вайцюшкевіча («Легенды горада майстроў», «Кларнет»), паразважаць пра іх арыгінальныя думкі і высновы.

Таксама, упершыню ў кнізе «Беларускае слова ад спеву» пад адной вокладкай апублікаваны гутаркі з музыкантамі «WZ-Orkiestra», якія па-свойму раскрываюць феномен Вайцюшкевіча з прафесіянальнага і сяброўскага пункту гледжання. Думаю, чытачам будзе цікавым пазнаёміцца з меркаваннямі пра агульную музычную творчасць скрыпачкі Ксеніі Мінчанкі, баяніста Аляксандра Шувалава, клавішніка Андрэя Лабчэўскага...

Заслуга Э. Олінай як ініцыятара выдання і ў тым, што яна не стала «цягнуць на сябе коўдру» ў падборы матэрыялаў кнігі «Беларускае слова ад спеву», а прапанавала паўдзельнічаць у яе стварэнні іншым журналістам і музычным крытыкам. Ад гэтага першая публіцыстычная біяграфія знанага беларускага выканаўцы З. Вайцюшкевіча толькі выйграла. Кожны з аўтараў зрабіў свой унёсак у змест, урэшце, у дыскурс выдання. Так эмацыйна ўзвышаныя тэксты Паўла Севярынца, нібыта камертоны, задаюць тон і акрэсліваюць беларускае разуменне культурных з'яваў сучаснасці. Сама кніга распачынаецца эсэ П. Севярынца «Спеўны голас», у якім аўтар высока ўздымае планку для айчынных выканаўцаў-вакалістаў: «Беларускі вакал — голас новага еўрапейскага абуджэння. Спеў, народжаны ў міжмор'і, зразумелы і Захаду, і Усходу, голас, які захлынае душу пяшчотай і ласкай з самага сэрца...» Цікавым і датычным усяму зместу кнігі стала этнаграфічнае эсэ таго ж аўтара — «Нёмана чыстая плынь».

Што тычыцца часткі кнігі, якую прадставіў іншы яе складальнік — аўтар гэтых радкоў, — то яна ўяўляе сабой панараму ўсяго, што ствараласа мной на тэму творчасці З. Вайцюшкевіча за доўгія гады нашага знаёмства — інтэрв'ю, музычныя агляды, рэпартажы, рэцэнзіі з нашай сумеснай з В. Мартыненкам кнігі, а таксама кароткі нарыс творчасці спевака — «Зміцер Вайцюшкевіч: у авангардзе беларускай культуры XXI стагоддзя», які ўпершыню пабачыў свет у «Новым Часе» (№11, ад 4.04.2008). Гэтыя тэксты я разглядаю з большага як крытычна-папулярызатарскія, але ў кантэксце кнігі многія тагачасныя думкі і высновы з часам зрабіліся нечаканымі нават для самога сябе!

Нельга не адзначыць і іншых аўтараў, чые тэксты дадалі стылістычнай разнастайнасці гэтаму біяграфічнаму выданню. Гэта Вітаўт Мартыненка, Генадзь Кеснер, Сяргей Будкін, Міхася Скобла, Зміцер Падбярэзскі, Вальжына Корсак, Яна Шыдлоўская і іншыя. Разам гэтыя музычныя крытыкі і журналісты на чале з Э. Олінай стварылі кнігу, якая чытаецца, як кажуць, на адным дыханні, захапляе і раскрывае той грандыёзны жыццёвы праект, які рэалізуе Зміцер Вайцюшкевіч, — адрадзіць нацыянальны мелас, данесці да слухачоў праўдзівае слова айчыннай паэзіі, запачаткаваць традыцыю прафесіянальнай нацыянальнай папулярнай музыкі. Адным словам, паказаць творчасць сапраўднага народнага артыста Беларусі XXI стагоддзя. Хоць дагэтуль ніяк не ўганаравагана дзяржавай.

ПОШТА

# ГНЕЎ НАРОДА — КРАЙНЯЯ НЕАБХОДНАСЦЬ

**Пасля чарговай абразы Лукашэнкам сваіх апанентаў жыхар Гомеля не вытрымаў. І патрабуе ад кіраўніка дзяржавы публічнага папрасіць прабачэння. Пры гэтым ён падкрэслівае, што не з'яўляецца сябрам ніякіх палітычных партый. Сваё меркаванне пра выбары і атмасферу ў краіне ён выклаў у лісце ў рэдакцыю газеты і падмацаваў яго артыкуламі Канстытуцыі і Крымінальнага кодэкса. Друкуем ліст чытача з Гомеля Валерыя Яроцкага са скарачэннямі.**

За дзень да выбараў я патэлефанаваў Юры Клімовічу (кіраўніку Гомельскага штаба кандыдата Рымашэўскага) і запытаў, дзе намячаецца сустрэча з кандыдатам у прэзідэнты Кастусёвым. Ён мне адказаў, што сустрэча прызначана на 18.00 у школе № 26, што ён таксама збіраецца туды прыйсці. Пры выхадзе з дому Клімовіча арыштавалі. Затрымлівалі яго двое міліцыянераў (без прад'яўлення дакументаў). У дзень выбараў яго трымалі ў міліцыі. Тым самым здзейснілі злачынства па артыкуле 191, ч. 2 КК РБ (перашкода ажыццяўленню выбарчых правоў грамадзянінам, здзейсненая службовай асобай з выкарыстаннем сваіх службовых паўнамоцтваў, прадугледжвае да 5 гадоў пазбаўлення волі).

20 снежня 2010 года Клімовіча павялі ў суд, і ў закрытым пасяджэнні суддзя Дамненка вынесла пастанову — 15 сутак арышту за абразу. Ілжэсведка ў судзе так і не з'явіўся. Клімовіч з першага дня абвясціў галадоўку. 15 дзён голаду і ўмовы ўтрымання нанеслі сур'ёзную шкоду яго здароўю. Ён вельмі схуднеў і нават пажаўцеў.

Як выявілася, 20 снежня 2010 года аналагічна былі арыштаваныя прадстаўнікі штабоў Някляева і Статкевіча. Ім вынеслі вырок — па 12 сутак арышту. Прадстаўніка штаба Саннікава не змаглі знайсці, бо ён не насіў з сабой мабільны тэлефон.

19 снежня ў 13.00 я прыйшоў на выбарчы ўчастак № 36, які размяшчаўся ў школе № 67 Гомеля. Побач з нашым участкам знаходзіліся яшчэ тры ўчасткі. Міліцыі было больш за выбарцаў, прычым у асноўным міліцыянты расхаджвалі каля буфета. Калі я туды зайшоў, то не паверыў уласным вачам: у буфеце школы прадавалі гарэлку і віно на разліў.

Назіральнікаў ад СНД на ўчастках не было. Я яшчэ тры гадзіны знаходзіўся на ўчастку, прадстаўнікі ад СНД так і не з'явіліся. Не было і прадстаўнікоў «экзіт-пола». Мне сказалі, што назіральнікі былі з раніцы (адзначыліся). Пасля я прайшоў яшчэ 10 выбарчых участкаў, і нідзе не сустрэў назіральнікаў ад СНД. Таму я не змог паведаміць ім пра незаконны арышт Клімовіча. Затое ў зацемненым месцы аднаго з дамоў убачыў траіх маладых людзей з паменшанай выбарчай урнай. Калі яны заўважылі мяне, то чамусьці спужаліся. Звесткі пра арышт я перадаў мясцовым назіральнікам на некалькіх участках.

Краіна адкацілася да першабытнаабшчыннага ладу. Канстытуцыя не выконваецца, парушаецца амаль кожны артыкул. Выбары залежаць ад аператыўных дзеянняў Васі Пупкіна, і, як вынік, мы маем прабітыя галовы кандыдатаў.

Злачынствы ў дачыненні да кандыдата ў прэзідэнты Някляева з'яўляецца замахам на яго жыццё. Яно было здзейснена ў 19.30. Гэта значыць, у той момант, калі ён яшчэ прэтэндаваў на пасаду прэзідэнта. Гэта злачынства падпадае пад артыкул 366 ч. 2 Крымінальнага кодэкса, што прадугледжвае да 8 гадоў пазбаўлення волі выканаўцу і заказчыку. І, згодна з арт. 12 ч. 4 КК РБ, з'яўляецца цяжкім.

Някляева абавязаны неадкладна вызваліць, і па дадзенай справе ён павінен праходзіць як пацярпелы кандыдат у прэзідэнты.

Зараз спецслужбы выбіваюць ілжэсведчанні, прычым у кандыдатаў у прэзідэнты. Згодна з арт. 27 Канстытуцыі, доказы, атрыманыя з парушэннем закона, не маюць юрыдычнай сілы.

У сувязі з выкладзеным вышэй, «гнеў народа», які выявіўся 19 снежня з 22 да 23 гадзін, не з'яўляецца злачынствам (артыкул 36 ч. 1 Крымінальнага кодэкса — крайняя неабходнасць). Не з'яўляецца злачынствам дзеянне, здзейсненае ў стане крайняй неабходнасці (у абарону інтарэсаў грамадства, дзяржавы). Абарона Канстытуцыі РБ і з'яўляецца «крайняй неабходнасцю».

АГЛЯД

# НОВЫЯ ВЫСТАВЫ

Аляксей ХАДЫКА

**Днямі ў Мінску адчыніліся дзве персанальныя і, як падаецца, удалыя выставы мастакоў-жывапісцаў.**

29 студзеня галерэя «Ла-Сандрарт», што на вуліцы Гарадскі Вал, парадавала наведвальнікаў вернісажам сённяшняга мінчука, выхадца з Рагачоўшчыны, Генадзя Драздова — выставу можна лічыць трошкі запозненым паказам творчага набытку да 50-годдзя аўтара.

Экспазіцыя атрымалася надзвычай добрай: улічваючы невялікія памеры галерэі, персанальныя выставы ў ёй глядзяцца значна арганічней, чым калектыўныя. Да таго ж прастора пад дэманстрацыю твораў была арганізавана вельмі ўдала, вылучаючы ў цэнтры кожнай экспазіцыйнай паверхні найлепшую работу з некалькіх стылёва-пошукавых накірункаў, якія распрацоўвае мастак.

Сказанае — не паказчык эклектычнасці творчасці Генадзя Драздова: яна ў цэлым адзначана схільнасцю да выразнага, глыбокага, але гарманічнага каларыту і жаданнем дасягнуць пэўнай наратыўнасці з гульнёй шматлікіх сэнсаў. Полістылізм жа вынікае з жадання арыентавацца на ўлюбёныя творчыя вяршыні папярэднікаў. Адна з іх — сюррэалізм з рэверансамі ў бок Далі. Іншыя ж звязаныя з айчыннай школай мастацтва. У некаторых працах адчуваеш рэха эзатэрычна-міфалагічных вобразаў і яркага каларызму Савіча з Селяшчуком. Дзесьці адгукаюцца вобразныя рэбусы Руслана Вашкевіча. Раптам усплываюць цытаты класікі Марка Шагала.



Але найбольш дасканалымі, як мне падаецца, выглядае накірунак, дзе пэўная аплікацыйнасць колеравых плям і фактуры разам са зноў-такі выразнай гармоніяй сакавітага колеру — далёкія водгукі работ Зоі Літвінавай — спалучаюцца з даволі рэдкім для Драздова мінімалізмам сэнсавых дэталяў. І такая работа (на выставе яна адна) — не перастаўшы звяртацца да гледача пэўнымі сэнсавымі намёкамі: маленькая царкоўка ў далечыні ў праёме вакна, аплікаваны рушнік на ваканіцы, цені на сцяне, як абрысы твараў, — выгадна выйграе за кошт паэтычнай выбудаванасці і стрыманасці выказвання. Здаецца, гэта той накірунак, які хацелася б параіць надалей больш актыўна развіваць майстру, што дагэтуль знаходзіцца ў творчым пошуку.



Дададзім: Генадзь Драздоў уваходзіць у суполку «Пагоня», дзеля чаго на адкрыцці яго вітаў Алесь Марачкін. Выстава адчынена па 19 лютага.

Другая выстава — «ПроСвет» (так па-руску, з гульнёй сэнсаў) Рыгора Іванова з суполкі «Арцель», адчынілася 1 лютага (працуе па 12 лютага) у Музеі сучаснага мастацтва, змяніўшы адметную калектыўную экспазіцыю скульптуры Анатоля Арцімовіча і яго вучняў.

Паралельна ў музеі працуе экспазіцыя абсалютна непаўторных графічных твораў Андрэя Скіцёва, якую таксама варта наведаць. Рыгор Іваноў не рабіў персанальных паказаў у Музеі сучаснага мастацтва 15 гадоў, і бягучая выстава — своеасаблівая справаздача за апошнія гады творчасці.

Скажам адразу, яна трапляе ў шэраг найбольш значных падзей у галерэйным жыцці сталіцы апошняга часу, вылучаючыся яскравай энергетыкай твораў і колеравым аптымізмам прадстаўленых работ. Невыпадкова сам мастак на адкрыцці параўнаў уласную экспазіцыю з букетам кветак, які ён прэзентуе сваёй жонцы-мастачцы і ўсім гледачам. Толькі букетам для вачэй. Цікава, як ідэю экспазіцыі ён сфармуляваў у тэкставай прэамбуле да паказу.

«Ноччу, гледзячы на бясконцае неба, уяўляеш, што знаходзішся ў вялізнай цёмнай адрыне, і як зоркі свецяць на небе, гэтак і яе сцены прарэзаны мноствам светланосных шчылінак. Ты падступаешся да іх вачыма і разумееш, што за бачнай цемрай знаходзіцца ў тысячу разоў больш свет святла. І кожная шчылінка — зорачка, «ПроСвет» у іншы свет… альбо гэта тонкая стужка святла, якая прабіваецца скрозь прыадчыненыя дзверы».

Крытык мастацтва Вольга Каваленка слушна заўважыла на адкрыцці, што працы Рыгора Іванова медытатыўныя і патрабуюць рэзананснага дачынення з імі ў адзіноце. На вернісажы гэта было немагчыма з прычыны вялікай колькасці гасцей. Але пакуль не позна наведаць музей і скарыстацца парадай знаўцы, пагрузіўшыся ў паэтычна-прыцягальны свет мастацтва Рыгора Іванова.

КІНО

# РЫЦАРЫ СУПРАЦЬ ВЕДЗЬМАЎ

Андрэй КРЫНІЦЫН

**Карціна Даменіка Сены «Час ведзьмаў» — містычныя прыгоды, што вяртаюць у залатую эпоху «Конанаў-барбараў» з улікам кампутарных тэхналогій і эпасаў пра крыжовыя паходы. Тры з паловаю зорачкі.**




Два героі крыжовых паходаў, якія вярнуліся на радзіму, мусяць даставіць у горны кляштар дзяўчыну, якую абвінавачваюць у эпідэміі чумы. Ці вінаватая дзяўчына насамрэч, і што хаваецца за яе анёльскім аблічам?

Фільм з удзелам фактурнага Рона Пэрлмана і сур'ёзна-пакутлівага Нікаласа Кейджа — падарунак для аматараў фільмаў 1980-х гадоў. Дабро і зло, страшныя прыгоды, містычная атмасфера.

Для падлеткаў фільм архаічны, але аматары жанравых стужак карціну ацэняць.

Новы Час
Агульнапалітычная штотыднёвая газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар Кароль Аляксей Сцяпанавіч

Зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі РБ. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў». Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:** 220113, г. Мінск, вул. Мележа, 1–1234.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 268 52 81.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». г. Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова № 121

Падпісана да друку 04.02.2011. 8.00.

Наклад 6000 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.

Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.

Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы. Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.